Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 115 (28225) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРЫЗВАННЕ ВЯРТАЦЬ ВЕРУ І НАДЗЕЮ

Работнікам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з прафесійным святам — Днём медыцынскіх работнікаў. Самаддана і нястомна працуючы, вы штодзённа ратуеце і дорыце людзям самае каштоўнае — жыццё. Вы прыходзіце на дапамогу ў самыя цяжкія хвіліны, вяртаючы пацыентам веру і надзею. Ваша прафесія патрабуе вялікай самаадданасці, чуласці і цярпення. Гэта ваша прызванне.

Стабільна працуючая медыцынская галіна служыць надзейнай асновай сацыяльнай палітыкі нашай краіны, якая забяспечыла ў апошнія гады рост працягласці жыцця і нараджальнасці насельніцтва, зніжэнне смяротнасці.

Беларуская ахова здароўя славіцца сваімі традыцыямі найвышэйшага прафесіяналізму і міласэрнасці. Інтэнсіўна асвойваюцца перадавыя тэхналогіі, праводзяцца навуковыя даследаванні, ствараюцца новыя лекавыя сродкі, уводзяцца ў строй новыя медыцынскія ўстановы. Дасягненні беларускай медыцыны па заслугах ацэнены не толькі на радзіме, але і далёка за яе межамі.

У гэты святочны дзень ад усёй душы жадаю вам новых перамог і здзяйсненняў у вашай адказнай і высакароднай працы. Няхай нязменнай узнагародай за вашу работу будзе ўдзячнасць людзей, якім вы падарылі радасць жыцця і веру ў свае сілы. Жадаю добрага здароўя і дабрабыту вам і вашым сем'ям.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:

«Трэба шчыра сказаць, чаканні ў грамадстве ад пятага Усебеларускага народнага сходу вельмі вялікія. Гэта не нейкае дзяжурнае мерапрыемства. Чакаецца канструктыўная размова, якая вызначае лёс краіны і, вядома, сур'ёзна ўплывае на настроі людзей. Рашэнняў сходу чакаюць і прыхільнікі ўлады, і апазіцыя, і лібералы, і кансерватары. Напярэдзе вельмі важная, сур'ёзная работа для таго, каб аб'ектыўна ацаніць рэсурсы, якія мы маем, напрамкі і механізмы аднаўлення эканамічнага і сацыяльнага росту і паставіць напружаныя, але, галоўнае, рэальныя задачы».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.06.2016 г.

Долар ЗША	19967,00 ▼
Еўра	22465,00 ▼
Рас. руб.	305,17 ▲
Укр. грыўня	801,49 ▼

ISSN 1990 - 763X

■ Галоўны капітал

КАБ МЫ БЫЛІ ЗДАРОВЫМІ

Адна з найбуйнейшых шматпрофільных устаноў аховы здароўя, якая аказвае кваліфікаваную медыцынскую дапамогу не толькі беларусам, але і замежнікам, 10-я гарадская клінічная бальніца Мінска, занесена на Рэспубліканскую дошку гонару пераможцаў спаборніцтваў за 2011-2015 гады і 2015 год.

Сур'ёзныя бюджэтныя грошы былі затрачаны ў папярэднія гады на рэканструкцыю, рамонт, замену абсталявання, няспынную падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў у гэтай установе. Цягам года тут цяпер выконваецца каля 20 тысяч хірургічных аперацый, каля 80 тысяч чалавек атрымліваюць меддапамогу амбулаторна і звыш 36 тысяч — у стацыянары. Да паслуг пацыентаў самыя шырокія і даступныя магчымасці па дыягностыцы, лячэнні і рэабілітацыі, а трыццаць гадоў таму на Убарэвіча, 73 адкрыліся два наркалагічныя аддзяленні.

— На базе бальніцы функцыянуе пяць спецыялізаваных рэспубліканскіх цэнтраў — афтальмалагічны, хірургічнай панкрэаталогіі, алергалогіі і прафпаталогіі, таракальнай хірургіі, гастраэнтэралогіі, — адзначае **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Алена САНКОВІЧ**. — Тут размяшчаюцца яшчэ чатыры гарадскія цэнтры — дыябетычнай ступні, гастрадуадэнальных крывацёкаў, таракальнай хірургіі і традыцыйнай усходняй медыцыны. Адзінае ў краіне гнойнае таракальнае аддзяленне ратуе жыццё пацыентам з ускладненнямі пасля некаторых аператыўных умяшанняў. Для таго, каб выконваць падобныя аперацыі, неабходна мець адпаведныя кадры і самае сучаснае абсталяванне. У нас гэта ёсць.

СТАР. 6

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

НА ПАРТЫЗАНСКАЙ, 19

Налета найстарэйшаму выданню Беларусі — газеце «Звязда» — споўніцца 100 гадоў. Цэлая эпоха! Несумненна, самым складаным перыядам у ёй былі гады Вялікай Айчыннай. Тым не менш, вынік — 4 нумары ў акупаваным Мінску (пяты быў падрыхтаваны, але ў сувязі з масавымі арыштамі падпольшчыкаў так і не ўбачыў свет), 105 сярод непразлазных балот у партызанскай зоне на востраве Зыслаў, што на Любаншчыне.

Падпольшчыкі і партызаны, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у тыле ворага, ствараліі друкаваны орган Мінскага падполля, называлі газету цёпла і ласкава — «звёздачкай». Менавіта гэтыя людзі, многія з якіх былі журналістамі, рызыкуючы сваім жыццём і нават ахвяраваўшы ім, зрабілі гісторыю «Звязды» бесперапыннай.

Якой цаной даваўся кожны выпушчаны нумар, мы не раз расказвалі на старонках «Звязды». Самы час нагадаць і нават раскрыць новыя, невядомыя дагэтуль дэталі, успомніць усіх тых, хто спрычыніўся да гэтай важнай справы, зрабіўшы стагадовы летапіс найстарэйшага выдання краіны не толькі бесперапынным, а і ўнікальным.

СТАР. 5

ЗАДАВАЙЦЕ ПЫТАННІ, ВЫКАЗВАЙЦЕ ПАЖАДАННІ

Падчас правядзення пятага Усебеларускага народнага сходу будзе працаваць «гарачая» тэлефонная лінія. 22 чэрвеня 2016 года — з 11.00 да 18.00 гадзін і 23 чэрвеня 2016 года — з 10.00 да 13.00 гадзін.

Кожны ахвотны можа патэлефанаваць па шматканальных тэлефонах: 276-00-00, 282-00-00, задаць пытанні, выказаць пажаданні. Код Мінска — 8-017.

ЗА ЎСІМ БАЧЫЦЬ ЧАЛАВЕКА

Дзяржава і надалей будзе ўкладаць сродкі ў развіццё інфраструктуры і сацыяльных аб'ектаў

Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў падчас рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць. На чыгуначным вакзале ў Гомелі Прэзідэнт прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця рэгулярнага руху цягнікоў на электрычнай цязе па напрамку Гомель—Мінск—Гомель. Кіраўніку дзяржавы далажылі аб рабоце і планах па электрыфікацыі чыгуначных участкаў, што значна павышае эфектыўнасць грузавых і пасажырскіх перавозак, скарачае патрэбу ў паліўных рэсурсах і зніжае адмоўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе.

Тут жа гаворка ішла аб рэканструкцыі і ўзвядзенні рэспубліканскіх аўтадарог аж да 2019 года. Усяго ў 2017–2019 гадах плануецца рэканструяваць і пабудаваць 616,7 км рэспубліканскіх аўтадарог. У іх ліку траса М6 Мінск—Гродна—мяжа Польшчы. Конкурс на выкананне работ выйграў беларускі падрадчык. Калі рэканструкцыя гэтай дарогі пакуль у планах, то новая сучасная траса Мінск—Гомель ужо завершана, пра што далажылі Прэзідэнту. Яе афіцыйнае адкрыццё плануецца прымеркаваць да надыходзячага Дня Незалежнасці.

Прэзідэнт з цеплынёй паразмаўляў з чыгуначнікамі і жыхарамі Гомеля, якія прыйшлі на мерапрыемства на прывакзальнай плошчы. «Дзе б я ні быў, што б ні рабіў, я заўсёды кажу — самае лепшае, што ў нас ёсць, гэта людзі», — сказаў ён.

У Гомелі Аляксандр Лукашэнка таксама наведаў будаўнічую пляцоўку аб'екта па рэканструкцыі дзіцячай абласной клінічнай бальніцы. «Мы дамовіліся, што гэта будзе самая сучасная бальніца», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Асобныя даручэнні Аляксандр Лукашэнка даў у дачыненні да крыніц фінансавання будаўніцтва. Ён адзначыў, што ўдзельнічаць у гэтым павінны ўсе: і рэспубліканскі, і абласны, і гарадскі бюджэты, а таксама мецэнаты і бізнесмены.

Яшчэ адным пунктам праграмы рабочай паездкі стала наведванне СП ААТ «Спартак». «Я абсалютна не шкадую аб тых рашэннях, якія калісьці прыняў і вярнуў у рукі дзяржавы гэтыя прадпрыемствы, — заявіў Прэзідэнт, гаворачы пра лідараў кандытарскай галіны. — Я кіраваўся не нейкімі прыватнымі памкненнямі, а дзяржаўнымі інтарэсамі».

Аляксандру Лукашэнку далажылі аб вытворча-эканамічным, фінансавым стане і перспектывах развіцця прадпрыемства, а таксама аб рабоце кандытарскай галіны краіны ў цэлым. За мінулыя гады з моманту перадачы «Спартака» пад кантроль дзяржавы праведзена вялікая работа па рэканструкцыі і мадэрнізацыі прадпрыемства, павышэнні канкурэнтаздольнасці выпускаемай прадукцыі. Чакаецца, што ў бліжэйшыя два-тры гады фабрыка выйдзе на ўзровень лепшых аналагічных вытворчасцяў.

Прэзідэнт падкрэсліў, што стабільная і эфектыўная работа такіх прадпрыемстваў, як «Спартак», у першую чаргу ўплывае на магчымасць фінансаваць праекты ў сацыяльнай сферы і развіццё інфраструктуры. «Мы будзем займацца інвестыцыямі ў развіццё інфраструктуры і сацыяльных аб'ектаў. Думаю, што за гэту пяцігодку мы канчаткова рэканструюем ўсю медыцыну і адукацыю. Ахова здароўя і адукацыя — гэта галоўнае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, размаўляючы з калектывам «Спартака».

Кіраўніку дзяржавы таксама былі зададзены пытанні аб маючай адбыцца дэнамінацыі і цэнаўтварэнні, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

«Росту цэн у сувязі з дэнамінацыяй не будзе. Гэта я вам гарантую, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Мы за гэта адарвём галовы, калі хтосьці паспрабуе скарыстацца гэтым тэхнічным працэсам (гэта чыста тэхнічнае мерапрыемства)». Дзяржава таксама захавае кантроль над цэнаўтварэннем, але без залішняга ціску. У тым ліку з гэтай мэтай нядаўна падпісаны ўказ аб стварэнні Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Прэзідэнт таксама падзяліўся сваім меркаваннем аб эфектыўнасці цэнтралізаванага тэсціравання, адзначыўшы дваякае стаўленне да такой формы экзамену. Відавочны плюс у тым, што, дзякуючы існуючай сістэме, удалося практычна цалкам выкараніць карупцыю і выключыць магчымасць паступлення за хабар. «Але не ўсе выдатнікі школы ў будучыні становяцца лепшымі прафесіяналамі. Пры тэсціраванні мы не бачым чалавека, не бачым палёту думкі, яго разважанняў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы другі бок працэсу. «Думаю, нам не трэба зараз ні ад чаго адмаўляцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што сістэму трэба не ламаць, а «дапаўняць такім чынам, каб не страціць здольных і перспектыўных дзяцей». Прэзідэнт дадаў, што ў Беларусі падчас цяперашняй уступнай кампаніі пастараліся вырашыць праблему нестыкоўкі школьнай праграмы з заданнямі цэнтралізаванага тэсціравання.

Не засталася ўбаку і спартыўная тэма, у прыватнасці, чэмпіянат Еўропы па футболе, які праходзіць у Францыі. «Адсочваў асноўныя матчы. Не балею ні за каго. За футбол. І спрабую зразумець, у якім кірунку сягоння развіваецца футбол, — расказаў Прэзідэнт. — Я гляджу футбол з гэтых пазіцый. Гляджу, што ж трэба для таго, каб у нас футбол развіваўся, і што трэба для падрыхтоўкі нацыянальнай каманды».

■ Пра гэта сказана ў Праграме пяцігодкі

Экалогія і эканоміка: дзе знайсці баланс?

Паводле праекта Асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады, галоўная мэта дзяржаўнай экалагічнай палітыкі — стварэнне ўмоў для ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў і зніжэння антрапагеннай нагрузкі на навакольнае асяроддзе. І сёння многія спецыялісты ўпэўнены — ажыццявіць гэтыя планы немагчыма без укаранення ў розныя сферы нашага жыцця прынцыпаў «зялёнай» эканомікі. Наколькі вялікі шлях у гэтай сферы ўжо прайшла наша краіна? Якія кірункі экалагізацыі эканомікі стануць асноўнымі ў найбліжэйшыя гады? На гэтыя і іншыя пытанні «Звязды» адказаў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА.

— Андрэй Марленавіч, «зялёная» эканоміка названая своеасаблівым рэгулятарам паміж экалагічнымі і эканамічнымі інтарэсамі краіны...

— Беларусь разглядае гэты кірунак як стратэгічны метад рашэння сістэмных праблем, праблем захавання бяспекі прыродных рэсурсаў, занятасці насельніцтва, канкурэнтаздольнасці ў цэлым. «Зялёная» эканоміка актыўна развіваецца ў свеце. У яе аснове — інавацыйныя энергаэфектыўныя, альбо «зялёныя», тэхналогіі: яны кардынальна мяняюць прадукцыю, тэхналогіі і паводзіны спажыўца. Іншымі словамі, пры пераходзе на чыстыя тэхналогіі з'яўляюцца новыя рабочыя месцы, выпускаецца экалагічная прадукцыя, адпаведна паляпшаюцца здароўе насельніцтва і бізнес-клімат. Павялічваецца доля «чыстага», напрыклад электрычнага, транспарту. Да канца 2016 года мы распрацуем Нацыянальны план дзеянняў па ўкараненні прынцыпаў «зялёнай» эканомікі ў галіны народнай гаспадаркі Беларусі. Ён стане «дарожнай картай» для розных сектараў эканомікі і дазволіць выпрацаваць рашэнні, якія прывядуць да балансу паміж эканамічнымі і экалагічнымі інтарэсамі краіны.

— Апошнім часам распрацавана некалькі праграмных дакументаў па экалагізацыі эканомікі Беларусі. Якія кірункі «зялёнага» развіцця краіны з'яўляюцца прыярытэтнымі? Якія «зялёныя» праекты ўжо дзейнічаюць у Беларусі?

— Наша краіна максімальна зацікаўлена ў развіцці «зялёнай» эканомікі. Для вызначэння ўласнага шляху па экалагізацыі эканомікі Мінпрыроды рэалізуе некалькі праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Напрыклад, праект «Тэхнічная дапамога для падтрымкі развіцця «зялёнай» эканомікі ў Беларусі» накіраваны на ўдасканаленне прававых асноў развіцця «зялёнай» эканомікі, а «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі» рэалізуе практычныя мерапрыемствы. У рамках гэтых двух праектаў аналізуюцца і развіваюцца такія кірункі як дзяржаўныя «зялёныя» закупкі, экалагічныя інавацыі, сістэма экалагічнай маркіроўкі прадукцыі, арганічная сельская гаспадарка, экасістэмныя паслугі, экалагічны транспарт. Лічым перспектыўнымі «зялёнае» будаўніцтва, фарміраванне ўстойлівых «разумных» гарадоў, укараненне экалагічнага субсідавання, звязанага з адходамі вытворчасці, аднаўляльнай энергетыкай, транспартам.

Можна сказаць, «зялёная» мадэрнізацыя набірае тэмпы ў Беларусі, бо ўжо ажыццяўляюцца канкрэтныя меры па «азеляненні» эканомікі. Так, нядаўна ў заказніку «Налібоцкі» адкрылі гадавальнік для вырошчвання глушцоў. Ён дазволіць стварыць дадатковыя рабочыя месцы, штогод засяляць у дзікую прыроду да 45-70 птушак, прадаваць іх на беларускім і еўрапейскім рынках (раней мы не мелі магчымасці экспартаваць глушцоў), што дазволіць павялічыць папуляцыю ў іншых гадавальніках і аднавіць мікрапапуляцыю віду ў Еўропе.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Арганічная сельская гаспадарка з'яўляецца адным з аспектаў «зялёнай» эканомікі. Калі ў Беларусі з'явіцца свой «арганічны» закон?

— Сёння актуальнасць экалагізацыі сельскай гаспадаркі не выклікае сумненняў. Па ініцыятыве Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя летась урадам быў зацверджаны Нацыянальны план дзеянняў па прадухіленні дэградацыі земляў. У краіне пачалася комплексная работа над стварэннем механізму і неабходных прававых рамак для развіцця арганічнай сельскай гаспадаркі з улікам экалагічных складнікаў. Галоўную ролю ў гэтым працэсе іграе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Канцэпцыя закона «Аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі» ўжо адобрана, вядзецца работа над стварэннем праекта закона.

— Згодна з Парыжскім пагадненнем, краіны свету паступова адмаўляюцца ад выкарыстання неаднаўляльных прыродных рэсурсаў на карысць чыстай энергетыкі. Ці павялічваецца ў Беларусі доля выкарыстання «зялёнай» энергетыкі?

— Яшчэ 15 гадоў таму сектар аднаўляльнай энергетыкі быў прадстаўлены гідраэлектрастанцыямі, пераважна пабудаванымі ў часы СССР. У сучасным разуменні гэты сектар пачаў развівацца ў краіне адносна нядаўна. Сёння ў Беларусі дзейнічаюць больш за 650 установак па выкарыстанні энергіі сонца, ветру, натуральнага руху водных плыняў, біягазу, біямасы, цяпла зямлі — агульная магутнасць складае больш за 1000 МВт. Варта адзначыць, што пры росце выкарыстання аднаўляльных крыніц аб'ём атрыманай ад іх электраэнергіі ў агульным аб'ёме вытворчасці электраэнергіі ўсё яшчэ невялікі і, па звестках Белстата за 2014 год, склаў 134 млн кВт·гадзін, альбо каля 0,04% ад усяго аб'ёму электраэнергіі.

Да 2020 года доля вытворчасці першаснай энергіі з аднаўляльных рэсурсаў у Беларусі павінна складаць не менш за 6% у валавым спажыванні паліўна-энергетычных рэсурсаў. Летась у Беларусі была распрацавана Канцэпцыя энергетычнай бяспекі Беларусі на перыяд да 2035 года. Значная ўвага ў гэтым дакуменце ўдзяляецца аднаўляльным крыніцам энергіі. У адпаведнасці з прынятай канцэпцыяй, да 2035 года вытворчасць электраэнергіі з выкарыстаннем аднаўляльных крыніц энергіі павінна складаць не менш за 2,6 млрд кВт·гадзін у год.

Кацярына РАДЗЮК

У ЖЫЛКАМГАСЕ ЗДАРОВАЙ КАНКУРЭНЦЫІ НЕ БАЯЦЦА

Жыллёва-камунальнай сферы ў праекце Асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады прысвечаны цэлы раздзел. Пэўная ўвага там удзяляецца далейшаму развіццю рынку арэнднага жылля, комплекснай аўтаматызацыі і дыспетчарызацыі аб'ектаў гэтай гаспадаркі, прыцягненню ў сферу абслугоўвання і рамонту жыллёвага фонду арганізацый рознай формы ўласнасці і іншым важным кірункам. Як гэтыя палажэнні праграмы будуць выконвацца на практыцы, мы спыталіся ў намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзя ТРУБІЛЫ.

ЯШЧЭ 70 ТЫСЯЧ АРЭНДНЫХ КВАТЭР

— Увядзенне платы за карыстанне камерцыйным дзяржаўным жыллём (сёлета з 1 ліпеня) мае дакладна акрэсленыя мэты, — тлумачыць Генадзь Трубіла. — Атрыманыя грошы акумулююцца ў спецыяльным фондзе і надалей будуць выкарыстоўвацца толькі для будаўніцтва менавіта арэнднага жылля і мадэрнізацыі дзеля гэтых мэт іншых аб'ектаў дзяржаўнага жыллёвага фонду. А ўвогуле такое жыллё нашай дзяржаве патрэбна, каб зняць праблему пераезду людзей на месца сваёй новай працы. Каб нашы грамадзяне не шукалі часам даволі дарагія кватэры ў прыватнікаў, а былі ўпэўнены, што якаснае жыллё па даступных цэнах ім прапануе дзяржава. Заўважу, што цяпер у дзяржаўным сектары стаўкі па арэндзе прыкладна ўдвая ніжэй падобных цэннікаў у прыватнікаў.

А сур'ёзны попыт на такое жыллё, галоўным чынам, маецца сёння з боку вузкіх спецыялістаў (настаўнікаў, урачоў, інжынераў вытворчай сферы і іншых), якія атрымалі запрашэнне на працу ў іншы рэгіён. Развіццё гэтага кірунку вырашыць праблему свабоды руху і свабоды працоўнай міграцыі на тэрыторыі ўсёй краіны. Напрыклад, у Мінску цяпер ёсць каля 5,5 тысячы кватэр арэнднага жылля, з якіх прыкладна 2 тысячы кватэр было пабудавана ў апошнія гады. Тут адзначу, што па нашых папярэдніх падліках, пасля 1 ліпеня ў ранг арэнднага жылля ў краіне трапіць мінімум каля 70 тысяч кватэр, якія так і не будуць прыватызаваныя насельніцтвам.

ДЫСТАНЦЫЙНАЕ КІРАВАННЕ

— Так, нашы службы будуць і надалей працягваць комплексную дыспетчарызацыю сваіх аб'ектаў. Гэта даволі важная задача. Ужо цяпер у нас ёсць цеплавыя вузлы, абсталяваныя такой аўтаматыкай, якая дазваляе спецыялісту больш дакладна бачыць сітуацыю і кіраваць ёю праз пульт дыспетчара. Такім чынам скарачаецца колькасць персаналу (так званых абходчыкаў) па кантролі за паступленнем цяпла, вады, помпавых станцый і іншага абсталявання. Увядзенне гэтай сістэмы дазволіць абслугоўваць жыллёвы фонд краіны меншай колькасцю работнікаў, больш якасна і больш танна для канчатковага спажыўца. У Мінску такая сістэма ўжо дзейнічае.

УСЁ — ПА КОНКУРСЕ

— Адзначу і тэму ў палажэнні Праграмы, якая тычыцца прыцягнення ў нашу сферу прыватных арганізацый. Ужо сёння ў Мінску дзейнічае служба заказчыка. Гэта прадстаўнікі насельніцтва, якія арганізуюць працэс абслугоўвання як жыллёвага фонду, так і прыдамавой тэрыторыі. Гэта паслуга мае свой кошт. Арганізаваная служба аб'яўляе конкурс, на якім у якасці лота выстаўляецца такая паслуга. У конкурсе разам з дзяржаўнымі камунальнымі службамі ўдзельнічаюць і прыватныя структуры. Напрыклад, сёння прыватныя арганізацыі паспяхова ажыццяўляюць розныя рамонтныя работы, у тым ліку і капітальны рамонт будынкаў. Надалей мы прагназуем, што служба заказчыка будзе праводзіць конкурсы і на выбар падраднай арганізацыі для ўборкі прыдамавой тэрыторыі і пад'ездаў, па нейкім іншым тэхнічным абслугоўванні жыллёвага фонду. Выкарыстанне механізма конкурсаў стане здаровай канкурэнцыяй для ўжо дзеючых службаў.

«АД ЛІФТА»

— Цяпер перад намі стаіць задача замяніць і мадэрнізаваць за пяцігоддзе больш чым 11 тысяч ліфтаў, якія адпрацавалі нарматыўныя тэрміны эксплуатацыі. Задача сапраўды складаная, але выканальная. Больш за тое, яе неабходна выканаць абавязкова. У нас дзейнічае тэхнічны рэгламент Мытнага саюза, у якім гаворыцца, што да 2020 года неабходна замяніць усе ліфты, тэрмін эксплуатацыі якіх скончыўся. Нагадаю, што тэрмін эксплуатацыі ліфта складае 25 гадоў. А ў нашым жыллёвым фондзе яшчэ ёсць ліфты, якім больш за 30 гадоў, і яны працягваюць «ездзіць». Выканаць гэтую праграму ў поўным аб'ёме будзе крыху праблематычна з фінансавай прычыны. Справа ў тым, што ў нашай краіне замена ліфтаў фінансуецца выключна з бюджэту, што сёння не зусім лагічна. Асабліва гэта тычыцца тых дамоў, дзе доля прыватызаванага жылля складае 100%.

— Што тычыцца непасрэдна наяўнасці ліфтаў для замены, то іх у айчынных вытворцаў цяпер дастаткова, — упэўнены Генадзь Трубіла. — Падобны заказ цалкам можа выканаць наша прадпрыемства «Магілёўліфтмаш».

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Напярэдадні падзеі

ІНВЕСТЫЦЫІ, ЗАНЯТАСЦЬ, ЭКСПАРТ

На Гродзеншчыне зроблена шмат, але патэнцыял значна большы

Напярэдадні V Усебеларускага народнага сходу дэлегаты ад Гродзеншчыны (іх выбрана 350 чалавек) сустрэліся, каб абмеркаваць сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна і ўнесці свае прапановы на разгляд маючага адбыцца форуму.

— Безумоўна, Гродзеншчыне ёсць чым ганарыцца па выніках прайшоўшай пяцігодкі. Зроблены сур'ёзныя крокі і ў эканамічным развіцці, і ў сацыяльнай сферы. Але патэнцыял рэгіёна значна большы, — адзначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.** — Як яго рэалізаваць, як працаваць у новых эканамічных умовах, якія метады і механізмы, вобразна кажучы, уключаць? Зразумела, у нашых планах павышэнне эфектыўнасці работы эканомікі, той матэрыяльнай базы, якая створана ў тым ліку і за папярэднюю пяцігодку. Якімі метадамі кіравання трэба авалодваць і як прымяняць іх на практыцы — гэтыя пытанні таксама актуальныя. Як і ўдасканальванне дзяржаўнай палітыкі, размежаванне функцый дзяржаўнай і гаспадарчай дзейнасці, стварэнне новых рабочых месцаў, развіццё малога і сярэдняга бізнесу, ажыўленне ініцыятыўнасці дзелавых людзей.

За апошнія гады на Гродзеншчыне актыўна ствараліся новыя вытворчасці і мадэрнізаваліся дзейныя прадпрыемствы. У прыватнасці, на Гродзенскім мясакамбінаце пабудавалі цэх па вытворчасці сыравэнджаных вырабаў, у ААТ «Малочны свет» — цэх па вырабе сычужных сыроў, у Мастоўскім раёне — новы завод па вытворчасці крухмалу, у ААТ «Лідахлебапрадукт» — фабрыку па вытворчасці макаронных вырабаў. У ААТ «Беллакт» стварылі вытворчасць вадкага і пастападобнага дзіцячага харчавання, у ААТ «Карэлічы-Лён» правялі рэканструкцыю з установкай высокапрадукцыйнай лініі доўгага і кароткага валакна, на шклозаводзе «Нёман» арганізавалі вытворчасць шклаваты. Увялі ў эксплуатацыю 62 новыя малочнатаварныя комплексы, рэканструявалі пад сучасныя тэхналогіі 108 малочных фермаў...

Уладзімір Краўцоў падкрэсліў, што самая пільная ўвага ў эканоміцы будзе ў бягучай пяцігодцы ўдзяляцца пытанням інвестыцый, працоўнай занятасці, экспарту. Захаваецца і сацыяльная накіраванасць эканамічнай палітыкі.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prokopchik@zviazda.by*

ДАСЯГНЕННЕ МЭТ У НЯПРОСТЫХ УМОВАХ

Ад Віцебскай вобласці ў ліку 350 дэлегатаў на V Усебеларускім народным сходзе каля 40% — жанчыны, кожны дзясяты — прадстаўнік моладзі.

Падчас абласнога сходу дэлегаты абмеркавалі зробленае за 5 гадоў і планы на будучыню.

— Нагадаю, што мінулы Усебеларускі сход праходзіў пад дэвізам «За моцную і квітнеючую Беларусь». Асноўныя праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця за мінулую пяцігодку выкананы. Пры гэтым дасягненне мэт і задач праходзіла ў няпростых умовах, — канстатаваў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ.**

Губернатар падкрэсліў, што галоўным багаццем нашай краіны былі і застаюцца людзі. І добра, што дэмаграфічная сітуацыя паляпшаецца. Павялічыліся нараджальнасць і на 3,5 года — працягласць жыцця. На Віцебшчыне людзі жывуць у сярэднім 72,9 года...

За пяцігодку здалі пад ключ амаль што 2 мільёны квадратных метраў жылля. Справілі навасёлле прыблізна 20 тысяч чалавек. Не дапушчана і сур'ёзнага росту ўзроўню беспрацоўя. Стварылі больш за 9,7 тысячы новых працоўных месцаў. Распавядаючы пра стан эканомікі, губернатар прааналізаваў і недахопы.

Прыярытэты чарговай пяцігодкі відавочныя — стварэнне новых працоўных месцаў, рост і дыверсіфікацыя экспарту тавараў і паслуг, прыцягненне інвестыцый...

І надалей будзе падтрымлівацца прадпрымальніцкая ініцыятыва. Сёння на Віцебшчыне больш за 9 тысяч суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу, прыкладна 23 тысячы ІП. У агульным аб'ёме падатковых паступленняў у казну ўклад прадпрымальнікаў — 22%. Дзелавымі людзьмі ствараюцца новыя працоўныя месцы, арганізуецца вытворчасць тавараў на экспарт.

Дэлегаты падчас выступленняў таксама шчыра падзяліліся тым, што хвалюе, акцэнтавалі ўвагу на рэзервах, патэнцыяле развіцця. Падкрэслівалася, што гэта магчыма ва ўмовах палітычнай стабільнасці, спакою ў грамадстве.

Дабрабыт народа, упэўненасць грамадзян у заўтрашнім дні — найвышэйшая мэта дзяржавы. Гэта думка агучвалася ўдзельнікамі абласнога сходу. Дэлегаты паабяцалі спрыяць на сваіх працоўных месцах таму, каб усё запланаванае рэалізавалася.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

СУСТРЭНЕМСЯ НА МІНШЧЫНЕ!

Наступны тыдзень прынясе мноства прыемных сустрэч. У гэтым можна не сумнявацца. Звяздоўцы не спыняюць свае падарожжы да падпісчыкаў нашай газеты. Гэтая сямідзённа была надзвычай насычанай, наступная чакаецца не менш цікавай.

Ужо ў аўторак мы накіроўваемся на сустрэчы з нашымі чытачамі. Гэтым разам завітаем у цэнтральны рэгіён краіны — на Міншчыну. Прычым адразу ў некалькі раёнаў. У межах абласнога Дня падпісчыка мы накіроўваемся ў Нясвіжскі, Уздзенскі і Вілейскі раёны. Такім чынам, 21 чэрвеня Дзень падпісчыка газеты «Звязда» з 10 да 13 гадзін пройдзе на Нясвіжскім і Уздзенскім раённых вузлах паштовай сувязі (РВПС), а з 11 да 14 гадзін — на Вілейскім РВПС. Абавязкова прыходзьце!

Дарэчы, і ва ўсіх астатніх рэгіёнах Беларусі можна (і трэба!) аформіць падпіску на любімую «Звязду», калі вы такога не зрабілі дагэтуль. Заходзьце на наш партал zviazda.by у раздзел «Падпіска» — там усё літаральна «па палічках» раскладзена, якім чынам можна падпісацца. Дарэчы, ёсць шмат варыянтаў: у аддзяленнях сувязі «Белпошты», у кіёсках «Белсаюздруку», праз аўтаматызаваную сістэму АРІП. Можна падпісацца і праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» — на нашым партале выкладзена падрабязная (пакрокавая) інструкцыя, якім чынам гэта зрабіць.

Да завяршэння падпіскі засталіся лічаныя дні — не забудзьцеся падпісацца, каб 1 ліпеня атрымаць чарговы нумар «Звязды» — дарэчы, з праграмай тэлебачання. А пасля 9 жніўня разам сустрэць 99-годдзе найстарэйшай беларускай газеты!

Дзмітрый ВАСІЛЕЎСКІ:

■ Тры пытанні да ўлады

«У рабоце, як у музыцы, калі наладзіш усе інструменты, прыемна слухаць»

У сельскай гаспадарцы гарачая пара: аграрыі спяшаюцца нарыхтаваць як мага больш зялёных кармоў. Дрыбінскі раён, як і большасць у Магілёўскай вобласці, лічыцца сельскагаспадарчым, і заспець яго кіраўніка ў кабінеце сёння не проста. Трэба кантраляваць абстаноўку на месцах. Таму размова са старшынёй райвыканкама вялася, як той казаў, на бягу. Дзмітрый Васілеўскі на пасадзе старшыні ўсяго чацвёрты месяц, да гэтага ён узначальваў сельскагаспадарчае прадпрыемства «Эксперыментальная база «Спартак» у аграгарадку Фашчаўка Шклоўскага раёна. Так што сельскагаспадарчая тэма для яго, лічы, родная.

— Леташні год быў цяжкім для сельскай гаспадаркі, адчуваўся недахоп кармоў. Што робіцца ў раёне, каб сітуацыя не паўтарылася?

— На нарыхтоўцы травы і сіласу ў нас працуе 6 атрадаў. Дзве гаспадаркі СВК «Даманы» і СВК «Мір» для большай эфектыўнасці аб'ядналі ў адзін атрад. Спачатку ў «Даманах» заклалі каля 2 тысяч тон сенажу, потым пераехалі касіць у «Мір». Наогул стаіць задача нарыхтаваць на зімне-стойлавы перыяд на кожную ўмоўную галаву буйной рагатай жывёлы 26 цэнтнераў кармавых адзінак. Гэта 4 тысячы тон сена, 67 тысяч тон сенажу, 55 тысяч тон сіласу. Тэхніка за апошнія некалькі гадоў не абнаўлялася, мае свой фізічны знос, сваю амартызацыю, але ўся падрамантавана, на ёй працуюць вопытныя механізатары. Наша мэта максімальна напоўніць сянажныя траншэі і нарыхтаваць сена па новай тэхналогіі — у палімернай плёнцы.

Паставілі сабе ўмовы за два тыдні гэтыя работы выканаць, працоўны дзень у нас зараз з 6 раніцы да 21.00. Прыцягваем тэхніку з прадпрыемстваў раёна.

Кантроль за ходам работ вядуць як спецыялісты сельгаспрадпрыемстваў, так і актыў раёна. Ёсць мабільныя групы з адказных работнікаў райвыканкама, якія вядуць нагляд нават ноччу. Маніторынг з боку абласных улад вельмі сур'ёзны, на дзень па дзве-тры камісіі прыязджае і правярае корманарыхтоўку: што косяць, якое драбленне, якая трамбоўка, якая тэмпература, якая вільготнасць. Прычым не толькі кантралююць, але і дапамагаюць. Напрыклад, група спецыялістаў на чале з першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама Алегам Чыкідам працавала на ўгоддзях «Трылесіна-агра». Нарыхтавалі каля 207 тон і склалі ў вялікія сцірты.

— Травы скончацца, а што потым?

— Цяпер мы ўбіраем шматгадовыя травы на раллі і лугавых угоддзях. Потым пойдзе ўборка аднагадовых азімых культур, яравых. Наступны этап — уборка рапсу, збожжавых і зернебабовых, падрыхтоўка да сяўбы азімых і іх сяўба, уборка кукурузы. Адначасова рыхтуем жывёлагадоўчыя аб'екты да зімоўкі. За перыяд з 20 ліпеня па 30 верасня ўсе работы павінны быць выкананы. Застанецца толькі пад'ём зяблёва. Каб усюды паспець, праца павінна выконвацца ў рытме: раніцай паветра ўдыхнуў, а вечарам выдыхнуў.

Чалавеку прыемна, калі ён бачыць вынікі сваёй працы. Хочацца, каб у раёне існавалі вялікія пляцоўкі для работы, з'явілася больш працоўных месцаў. Трэба прыдумваць нейкі інавацыйны прадукт. Некаторым кіраўнікам у раёне не хапае агню ў вачах. Трэба на метр падняцца на зямлёй, убачыць праблемы і вырашаць іх. Кожны кіраўнік павінен у душы быць бізнесменам. Незалежна ад таго, дзе ён працуе — у сельскай гаспадарцы, вытворчасці ці яшчэ дзе-небудзь. Павінна быць камерцыйная жылка, адчуванне моманту.

А яшчэ не трэба паказчыкі вытворчай дзейнасці раздзяляць з навядзеннем парадку. Нашмат больш прыемна адчуваць сябе там, дзе і трава скошана, і гною не відаць, і старыя падмуркі з-пад зямлі не выглядваюць... Добра, калі гэта разумее і кіраўнік гаспадаркі. Мы павінны быць як адна каманда. Гэта, як у музыцы: калі наладзіш усе інструменты, прыемна слухаць.

— Дзмітрый Уладзіміравіч, як дэлегат V Усебеларускага народнага сходу, якія перспектывы вы бачыце ў развіцці вашага раёна?

— У мінулай пяцігодцы Дрыбінскі раён зрабіў першыя крокі ў выкарыстанні свайго экспартнага патэнцыялу. У 2015 годзе экспарт склаў 1 мільён долараў, а экспарт паслуг — 17 тысяч долараў. Сёння перад усімі суб'ектамі гаспадарання пастаўлена задача рабіць усё для паляпшэння гэтых вынікаў.

Вялікія спадзяванні ўскладаюцца на прыватны бізнес. На 1 красавіка ў раёне налічвалася 88 камерцыйных арганізацый і 145 індывідуальных прадпрымальнікаў. Суб'ектамі прадпрымальніцтва раёна фарміруецца ўжо больш за 20% паступленняў у бюджэт. У чарговай пяцігодцы будзе працягнутая праца па развіцці прыватнага бізнесу і прыцягненні інвестыцый у раён, у тым ліку і прамых замежных. Для гэтага маюцца 11 інвестыцыйных пляцовак, размешчаных паблізу аграгарадкоў, тры з іх створаны сёлета. На сайтах дзяржорганаў размешчана інфармацыя аб існуючай сыравіннай базе, аб'ектах нерухомасці, якія чакаюць сваіх інвестараў.

Сёння на тэрыторыі раёна паспяхова рэалізуюцца два інвестпраекты па альтэрнатыўнай энергетыцы. Аб'ем інвестыцый толькі па адным з іх склаў 63 мільярды рублёў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

УКРАІНА ПЕРШАЙ СЫШЛА З ДЫСТАНЦЫІ

Зборная нашых суседзяў стала першай краінай, якая страціла шанцы на выхад у плэй-оф. Даволі моцную і тэхнічную каманду «адчапілі» безвыніковай нічыёй немцы і палякі. А крыху раней украінцы нічога не змаглі зрабіць з брытанскай упартасцю каманды Паўночнай Ірландыі. Іншых кандыдатаў на вылет было шмат, але менавіта Украіна першай пакідае Еўра-2016, прычым ужо пасля другога круга, не забіўшы сапернікам ніводнага гола. Ну, а зборная Паўночнай Ірландыі святкавала сваю першую ў гісторыі чэмпіянатаў Еўропы перамогу.

СЭРЦА НЕ ВЫТРЫМАЛА

У час вышэйзгаданага матча адбыўся трагічны выпадак — пасля першага гола футбалістаў Паўночнай Ірландыі прама на стадыёне Ліёна памёр 64-гадовы балельшчык гэтай каманды. Яму стала дрэнна, а ўрачы канстатавалі смерць ад сардэчнага прыступу. У чарговы раз на буйных спаборніцтвах адбыўся такі выпадак, прычым трагічнай можа стаць не дрэнная гульня ці вынік сваёй зборнай, а станоўчая падзея.

ГРЭНАДЗЁРЫ ЕЎРА-2016

Звычайна самыя высокія спартсмены ў гульнявых відах спорту — гэта баскетбалісты і валейбалісты. Але і сярод футбалістаў хапае фактурных гульцоў, прычым не галкіпераў. Сайт championat.com вылучыў дзясятку веліканаў у полі сёлетняга Еўра, якую мы вам і прапануем.

Па 194 сантыметры росту маюць абаронцы англічанін Крыс Смолінг і немец Джонатан Та, паўабаронца бельгіец Маруан Фелаіні, нападаючы італьянец Грацыяна Пеле і польскі абаронца Барташ Саламон. Адыёзны швед Златан Ібрагімавіч *(на фота)*, які ўжо цяпер лічыць сябе легендай футбола, мае ў актыве 195 сантыметраў разам з коскай. На 196 «вымахалі» нападаючыя Марк Янка з каманды Аўстрыі, Арцём Дзюба са зборнай Расіі і ўкраінец Філіп Будкоўскі. Ну і лідарам па вертыкальных «габарытах» на Еўра-2016 стаў украінскі абаронца Яўген Хачарыдзі — яго рост складае 198 сантыметраў.

ЗДЫМАЎ СТРЭС?

Нападаючы зборнай Румыніі Дэніс Алібек вызначыўся тым, што... курыў у раздзявальні перад сваёй заменай у матчы з французамі! Памочнікі не знайшлі форварда на лаўцы запасных, калі трэнер загадаў ім рыхтаваць яго на замену, а заспелі яго ў раздзявальні за курэннем. Нягледзячы на гэта, футбаліста выпусцілі на поле. Цікава, гэта Алібек так стрэс здымаў, ці з'яўляецца даўнім парушальнікам спартыўнага рэжыму?

Іван КУПАРВАС.

■ Класныя навіны

ШКОЛЫ НЕ ЗАСТАНУЦЦА БЕЗ ПЕДАГОГАЎ?

Трэць навучэнцаў педагагічных класаў ужо вызначыліся з выбарам прафесіі

«Малады настаўнік павінен быць не з баязлівага дзясятка. Звярнуць на сябе ўвагу дзяцей — новая суперздольнасць. Прыйшоў час гераічнага!»

«Нарэшце, настаў той дзень, калі мне пашчасціла адчуць сябе настаўнікам. Гэты момант быў непазбежны. Ура! Канешне, я была ўсхваляваная гэтай падзеяй. Я чакала многае, але дзеці — гэта заўсёды энергія юнацтва. Дзе мае 12 гадоў?»

«Як жа прыемна быць настаўнікам. Мы можам навучыць дзяцей чаму-небудзь добраму».

«Сёння замяняў «Чалавек і свет» у 2 «Г» класе. Вельмі адкрытыя, працалюбівыя і вясёлыя дзеці. Урок прайшоў цудоўна. Жадаю ім удачы ў вучобе!»

«Вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца — вось галоўны наказ, мой юны вучань!»

«Цяжка ў вучобе? Давайце дапаможам 7 класу, які стаў нам як родны».

Аўтары гэтых радкоў яшчэ не маладыя педагогі, але вельмі спадзяюцца імі стаць. Сваімі думкамі і ўражаннямі ад першых прафесійных спробаў дзеляцца ў сваіх блогах вучні профільных педагагічных класаў 20-й сталічнай гімназіі. Менавіта гэта навучальная ўстанова стала піянерам у адраджэнні педагагічных класаў: тут у 2014 годзе былі адкрыты чатыры профільныя 10-я класы, якія ўзяў пад сваю апеку Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт. Фактычна яны пачалі функцыянаваць, калі ў краіне яшчэ не была створана для іх нарматыўна-прававая база.

Між іншым, у 1990-я гады ў 176-й мінскай школе (якая пазней была пераўтворана ў 20-ю гімназію) ужо дзейнічалі фізіка-матэматычныя і філалагічныя педагагічныя класы. І сёння іх выпускнікі працуюць у роднай школе, але ўжо ў якасці педагогаў. Чым не выдатная наглядная агітацыя за прафесію настаўніка?

ІДЭЯ, АКТУАЛЬНАЯ ДЛЯ ЎСІХ

Мінулы навучальны год вызначыўся адкрыццём педагагічных класаў ужо па ўсёй краіне. Днямі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка прайшла рэспубліканская канферэнцыя, якая сабрала прадстаўнікоў педагагічнай грамадскасці, вучоных і вядучых спецыялістаў-практыкаў у галіне профільнай і прафесійнай педагагічнай адукацыі. У цэнтры іх увагі аказаліся вопыт, праблемы і перспектывы педагагічных класаў.

Рэктар БДПУ, прафесар Аляксандр ЖУК канстатуе, што ў грамадстве і СМІ ўсё часцей падымаецца тэма адраджэння прэстыжу настаўніцкай працы. У нашай краіне ўсё больш адчувальная дзяржаўная падтрымка педагога, што робіць настаўніцкую прафесію канкурэнтаздольнай і прывабнай.

Дарэчы, ідэя падрыхтоўкі вучняў да свядомага выбару педагагічнай прафесіі становіцца ўсё больш папулярнай не толькі ў нас. У Еўропе лідзіруючую пазіцыю ва ўкараненні ідэй профільнай педагагічнай падрыхтоўкі ў школе займае Чэхія, у якой у 2011 годзе стартаваў праект па арганізацыі працы педагагічных ліцэяў і школ.

Ва ўмовах 13-годкі там рэалізуюцца тры мадэлі профільнага навучання: чатырохгадовая праграма інтэграванай педагагічнай і агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі, пачынаючы з 10-га класа, шасцігадовая праграма — з 8-га класа і васьмігадовая — з 6-га класа. Выпускнікам педагагічных школ і ліцэяў прысвойваецца кваліфікацыя выхавацеля дзіцячага садка, кіраўніка дзіцячага гуртка, памочніка выхавальніка ў інтэрнаце, а таксама прадастаўляецца права прывілеяванага паступлення ва ўніверсітэты, якія ажыццяўляюць прафесійную падрыхтоўку настаўнікаў.

Важны кірунак — праца з бацькамі навучэнцаў педагагічных класаў, якія могуць або падтрымаць выбар дзіцяці, або, наадварот, навязаць ім сваю думку і свой выбар. Для школы яны галоўныя саюзнікі...

ПАРТФОЛІА ДЛЯ БУДУЧАГА НАСТАЎНІКА

У 2015/2016 навучальным годзе ва ўсіх рэгіёнах і ў сталіцы было створана больш як 100 педагагічных класаў і груп, якія ахопліваюць больш як 1440 навучэнцаў. Сутнасць профільнай падрыхтоўкі заключаецца ў вывучэнні пэўных вучэбных прадметаў (матэматыкі, фізікі, гісторыі і іншых) на павышаным узроўні, а таксама факультатыўных занятках «Уводзіны ў педагагічную прафесію». Гэта першая мадэль. Другая мадэль — стварэнне груп навучэнцаў з розных класаў у паралелі школы, якія вывучаюць вышэйзгаданы факультатыўны курс. Прапануецца і трэцяя мадэль — стварэнне ў сельскай мясцовасці міжшкольнага факультатыву.

Факультатыўны курс разлічаны на 140 гадзін і падзелены на чатыры змястоўныя модулі: «У свеце педагагічнай прафесіі» (10 клас), «Чалавек, які пазнае: практычная псіхалогія пазнання» (10 клас), «Я ў педагагічнай прафесіі» (11 клас) і «Пазнай самога сябе» (11 клас).

Змест праграмы факультатыўных заняткаў прымушае старшакласнікаў шукаць адказы на шэраг пытанняў. Што такое педагагічная прафесія? Якое месца педагогікі ў свеце іншых прафесій? У чым яе спецыфіка? Якія патрабаванні прад'яўляюцца да настаўніка? Што ён павінен умець? Якімі якасцямі павінен валодаць? Ці магу я быць настаўнікам? Ці ёсць у мяне прафесійна важныя якасці? І гэтак далей.

На працягу двух гадоў навучання школьнік стварае партфоліа «Я — педагог». У ім фіксуюцца вынікі яго вучэбнай і педагагічнай дзейнасці па засваенні ўсіх чатырох модуляў вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў: эсэ, творчыя заданні, даныя самадыягностыкі, прэзентацыі, праекты, праца важатымі, памочнікамі класных кіраўнікоў у малодшых класах, валанцёрамі ў аздараўленчых лагерах, удзел у арганізацыі розных школьных мерапрыемстваў і гэтак далей. Там жа збіраюцца ацэначныя каментарыі педагогаў, аднакласнікаў і вынікі рэфлексіі самога навучэнца.

У 20-й сталічнай гімназіі вучні вядуць свае педагагічныя блогі ў сацыяльных сетках: «Інстаграм», «Фэйсбук», «ВКонтакте» ці «Твітары». Там жа яны дзеляцца і фатаграфіямі сваіх педагагічных спроб. Натуральна, што крэатыўнасць толькі вітаецца!

Напрыканцы навучання на падставе партфоліа адзінаццацікласнікі атрымаюць разгорнутую характарыстыку-рэкамендацыю педагагічнага савета для паступлення на педагагічныя спецыяльнасці, якая будзе заверана ў раённым упраўленні адукацыі.

Дарэчы, мяркуецца, што выпускнікі педагагічных класаў будуць карыстацца правам паступлення на педагагічныя спецыяльнасці без экзаменаў. У прыватнасці, тыя, хто атрымаюць рэкамендацыю педагагічнага савета і будуць мець у атэстаце адзнакі «7» балаў і вышэй па ўсіх прадметах вучэбнага плана, а па прадметах профільных іспытаў у ВНУ — не ніжэй як «8» балаў. Зразумела, не ўсіх школьных выдатнікаў ці «харашыстаў» можна дапускаць у школу ў якасці педагогаў. Менавіта таму і ўзнікла ідэя з партфоліа...

ПРАЦА НАД ІМІДЖАМ

У сярэдзіне навучальнага года педуніверсітэт правёў рэспубліканскае апытанне навучэнцаў педагагічных класаў, а таксама настаўнікаў, якія вядуць факультатыўныя заняткі «Уводзіны ў педагагічную прафесію». Высветлілася, што **прычыны выбару старшакласнікамі навучання ў педагагічных класах самыя разнастайныя. Сярод іх дамінуе матыў, звязаны з жаданнем вывучаць пэўныя прадметы на павышаным узроўні (36%). На другім месцы — матыў, звязаны з гатоўнасцю звязаць сваё жыццё з педагагічнай прафесіяй (24%). Далей ідуць магчымасць паступіць на педагагічную спецыяльнасць без экзаменаў (20%) і рэкамендацыя бацькоў (18%).**

Увагі заслугоўваюць і матывы, па якіх педагогі вырашылі выкладаць факультатыўны курс «Уводзіны ў педагагічную прафесію»: гэта магчымасць папулярызаваць педагагічную прафесію, дзяліцца са старшакласнікамі сваім педагагічным вопытам і ўплываць на іх рашэнне звязаць сваё жыццё з педагагічнай прафесіяй.

Даныя апытання сведчаць аб тым, што факультатыўныя заняткі дапамагаюць навучэнцам зразумець сутнасць і асаблівасці педагагічнай прафесіі: так сцвярджаюць 73% навучэнцаў і 54% настаўнікаў.

— Паказальная розніца ў адказах вучняў і настаўнікаў па гэтым пытанні. Відавочна, што педагогі больш песімістычныя ў сваіх прагнозах, чым навучэнцы, — адзначыў Аляксандр Жук. — Для нас гэта сігнал аб тым, каб мы больш даваралі вучням, іх здольнасцям да самавызначэння і рэфлексіі. Разумеючы агульнаразвіццёвую функцыю факультатыўных заняткаў, мы высвятлялі, наколькі выразна гэта праглядаецца ў змесце факультатыву і ацэньваецца навучэнцамі і настаўнікамі. Вынік адназначна станоўчы: пераважная большасць і настаўнікаў (85%), і вучняў (82%) аднадушныя ў меркаванні, што такія заняткі карысныя для асобаснага развіцця, незалежна ад таго, вучаца старшакласнікі ў педагагічным класе ці не.

І навучэнцам, і педагогам былі найбольш цікавыя тэмы «Будучыня педагагічнай прафесіі», «Імідж сучаснага педагога», блок заняткаў, скіраваных на самапазнанне сваіх здольнасцяў. Іх выбіралі ў сваіх адказах часцей за іншыя. У ліку найбольш цікавых тэм аказаліся і сустрэчы з ветэранамі педагагічнай працы.

«Трэба ацаніць і выкарыстоўваць патэнцыял такой формы работы з вучнямі па папулярызацыі прафесіі, як, зрэшты, і заняткі, прысвечаныя іміджу сучаснага педагога», — упэўнены Аляксандр Жук.

САЮЗ З БАЦЬКАМІ

Аптымістычнымі аказаліся і адказы на пытанне аб прафесійных намерах старшакласнікаў: траціна апытаных сцвярджаюць, што ўжо вызначыліся з выбарам педагагічнай прафесіі (34%). Але большая частка пакуль не вызначылася (56%). «Гэтыя навучэнцы з'яўляюцца нашым рэзервам, той мэтавай групай, на якую трэба будзе ў першую чаргу звярнуць увагу ў 11-м класе,» — дадаў Аляксандр Жук.

Як сведчыць атрыманы вопыт, эфектыўнасць педагагічных класаў залежыць у канчатковым выніку ад педагога, які займаецца з вучнямі. Для таго, каб сфарміраваць у старшакласнікаў матывацыю і ўмацаваць іх рашэнне выбраць педагагічную спецыяльнасць, вельмі важна, каб гэты факультатыў вялі ўлюбёныя ў сваю прафесію настаўнікі, якія дасягнулі ў ёй пэўных вышынь, прафесіяналы, якія на ўласным прыкладзе дэманструюць, што ў педагогіцы ёсць месца паспяховым і ўпэўненым у сабе людзям.

У 20-й сталічнай гімназіі вучні вядуць свае педагагічныя блогі ў сацыяльных сетках: «Інстаграм», «Фэйсбук», «ВКонтакте» ці «Твітары». Там жа яны дзеляцца і фатаграфіямі сваіх педагагічных спроб. Натуральна, што крэатыўнасць толькі вітаецца!

Яшчэ адзін важны кірунак — праца з бацькамі навучэнцаў педагагічных класаў, якія могуць або падтрымаць выбар дзіцяці, або, наадварот, навязаць ім сваю думку і свой выбар. Для школы яны галоўныя саюзнікі...

А ў далейшых планах БДПУ — узмацненне дапрофільнай педагагічнай падрыхтоўкі на другой ступені школы. Рэктар паведаміў, што ў краіне ёсць установы адукацыі, гатовыя стварыць на сваёй базе педагагічную гімназію, якая прадугледжвае арыентацыю школьнікаў на педагагічную прафесію, пачынаючы з 5-га класа. У перспектыве ў кожным рэгіёне краіны хацелася б адкрыць хоць бы па адной педагагічнай гімназіі. А пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце мараць адкрыць яшчэ і педагагічны ліцэй.

Надзея НІКАЛАЕВА. Фота аўтара.
nikalaeva@zviazda.by

■ Будзь у курсе!

У ВІЛЬНЮС ЧЫГУНКАЙ — БЕЗ ПРАБЛЕМ

Беларуская чыгунка прызначыла дадатковы цягнік міжнародных ліній №809/810 Мінск — Вільнюс з 14 ліпеня. Састаў будзе курсіраваць у дзённы час чатыры разы на тыдзень па панядзелках, аўторках, серадах і чацвяргах, паведамілі ў прэс-службе магістралі.

Цягнік будзе адпраўляцца з Мінска ў 14 гадзін 03 хвіліны і прыбываць у Вільнюс у 17 гадзін. У зваротным напрамку ён адправіцца ў 12 гадзін 30 хвілін і прыбудзе ў Мінск у 15 гадзін 27 хвілін. Пагранічны і мытны кантроль на тэрыторыі Беларусі пасажыры будуць праходзіць на станцыі Гудагай, а на тэрыторыі Літвы — у тэрмінале станцыі Вільнюс. Пасажырам, якія прыбываюць цягнікамі з Мінска ў Вільнюс і жадаюць далей прадоўжыць свой маршрут да Балтыйскага ўзбярэжжа да Клайпеды, пры прад'яўленні праязных дакументаў на праезд ад Мінска да Вільнюса ў касах АТ «Літоўскія чыгункі» прадастаўляецца зніжка ў 10 працэнтаў. Мэтай рэалізацыі гэтага праекта з'яўляецца ўзмацненне транспартных сувязяў паміж сталіцамі Беларусі і Літвы, пашырэнне магчымасцяў пасажыраў у выбары варыянту паездкі, павышэнне якасці аказваемых паслуг.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Ёсць нагода

ЗВЯЗАНЫЯ АДНОЙ МЭТАЙ

Сёння беларускі будуць вязаць у публічных месцах

У адну з субот чэрвеня ў розных краінах адзначаецца неафіцыйнае, нетрадыцыйнае, але ад таго не менш цікавае свята — Сусветны дзень вязання на публіцы (World Wide Knit in Public Day). Як сцвярджаюць энтузіясты вязальнага руху, яго заснавальніцай стала жыхарка Парыжа Даніэль Лендэс, якая ў 2005 годзе падахвоціла сваіх прыяцелек пакінуць душныя кватэры і ўзяць кошыкі з рукадзеллем на вольнае паветра.

Ідэя хутка набыла папулярнасць і ў аматараў вязання з іншых краін. Цяпер майстры не толькі займаюцца любімым хобі ў грамадскіх месцах (у парках, кавярнях, у грамадскім транспарце і нават у бібліятэцы!), але таксама дзеляцца з усімі ахвотнымі сакрэтамі вязання пруткамі ці кручком, арганізуюць дабрачынныя кірмашы вязаных вырабаў і нават праводзяць адмысловыя спаборніцтвы вязальшчыц. У акцыі нават з'явілася міжнародная эмблема — два перакрыжаваныя пруткі на фоне геаграфічнай карты Еўропы. Зрэшты, гэты лагатып паспеў ужо страціць актуальнасць — цяпер, паводле розных крыніц, Сусветны дзень вязання праходзіць не менш як у 300 гарадах Еўропы і ЗША, а сёлета да яго далучацца прадстаўніцы Кітая, Інданезіі, Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Аўстраліі...

Дарэчы, вось ужо некалькі гадоў, як з гэтай справай шчыльна «звязаліся» і беларусы. Напрыклад, у 2012 годзе ўдзельніцы публічнага вязальнага флэшмобу зладзілі ў сталічным парку Перамогі адкрыты майстар-клас для аматараў гэтага віду рукадзелля, выставу сваіх твораў, а таксама імправізаваны модны паказ. Плануецца зладзіць «выхад у людзі» і сёлета, прычым не толькі ў Мінску. Так, у Брэсце сёння ў межах Сусветнага дня вязання, акрамя ўласна вязання на публіцы, адбудзецца дабрачынная акцыя — перадача вязаных шалікаў, пальчатак і шкарпэтак у падарунак дзецям, якія знаходзяцца ў гарадскім сацыяльным прытулку.

Вікторыя ЗАХАРАВА

НА ПАРТЫЗАНСКАЙ, 19

Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ля хаты, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны друкавалася найстарэйшая газета краіны, наведалі магілу яе падпольнага рэдактара Міхаіла Барашкава

**У вёску Камсамолец, што на Салігоршчыне,
мы прыехалі позняй раніцай.
Жыхар з суседняга Доўгага,
наш падпісчык, сведчыў:
тут пахаваны рэдактар
партызанскай «Звязды»
Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў.
Знайсці магілу было няцяжка.
Яе, гэты адгалосак мінулай
вайны, ведае кожны месціч.
Ды і візуальна не заўважыць
добраўпарадкаванае,
абнесенае агароджай
пахаванне, проста немагчыма...**

У прыгожым месцы спіць вечным сном рэдактар-партызан Міхаіл Барашкаў. Тут, наводшыбе, побач з лесам, чуеш, як спяваюць птушкі, стракочуць конікі. Быццам волаты-ахоўнікі, вартуюць воінскае пахаванне пяць векавых хвой. Тры — на кожную магілу ў агароджы, дзве іншыя прытуліліся побач.

Тое, што ў яе хаце некаторы час ствараліся газеты «Звязда» і «Чырвоная змена», Марыя Чарнюк памятае добра. Хоць, прызнаецца, самі газеты, якія выходзілі тады з-пад друкарскага станка, яна ніколі не бачыла.

Супрацоўнікі падпольнай «Звязды» — друкар Емяльян ШУРПАЧ і рэдактар Міхаіл БАРАШКАЎ — за выпускам чарговага нумара газеты.

У партызанскай зоне ўсяго выйшла 105 нумароў. Прычым на Любаншчыне «Звязда» ўбачыла свет 98 разоў. Вядома, што апошні нумар партызанскай газеты быў надрукаваны ў Слуцку. Дзе друкаваліся астатнія шэсць, застаецца здагадвацца.

А можа, загадка ўжо разгадана? Па-першае, адсюль, з вёскі Камсамолец, да знакамітага Зыслава – рукой падаць. Па-другое, наўрад ці рэдактар у той складаны ваенны час быў удалечыні ад сваёй рэдакцыі. Пра тое, што яна сапраўды некаторы час размяшчалася ў Камсамольцы, сведчыць адна шыльда. Прычым яна вельмі сімвалічна прымацавана на хаце з красамоўнай назвай — Партызанская, 19. Відаць, таксама невыпадкова. Як доказ — надпіс на шыльдзе: «У гады Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Камсамолец знаходзіліся рэдакцыі падпольных газет «Звязда» і «Чырвоная змена».

Так, тут пахаваны не адзін Барашкаў. Магіла партызанскага рэдактара — у цэнтры. Годны помнік расказвае выпадковым мінакам, хто ляжыць у гэтай зямельцы. Іншыя пахаванні – безымянныя.

Загадка разгадана?

Магіла першага і — афіцыйна — адзінага рэдактара «Звязды»-партызанкі, а таксама ваеннай «Чырвонай змены» для многіх звяздоўцаў стала адкрыццём. Я, напрыклад, была цвёрда пераканана, што памерлага ад тыфу Міхаіла Парфёнавіча пахавалі дзесьці ў раёне вострава Зыслаў, што на Любаншчыне, — менавіта тут з 27 студзеня 1943 года і амаль да самага вызвалення сталіцы выходзіла наша газета. Праўда, ёсць адна дэталь.

Жывая сведка

Калі мы падышлі да хаты, гаспадыня Марыя Чарнюк сядзела на лавачцы. Відаць, яе папярэдзілі, што прыедуць карэспандэнты, бо вясковы клопат не церпіць адпачынку ў разгар светлавога дня.

Маленькая, худзенькая, яна прапанавала сесці побач. Я ўключыла дыктафон і прагна лавіла ўсе яе словы. Можа, яна — адзіная жывая сведка, якая памятае штосьці пра ваенную «Звязду» і яе рэдактара?

Надзею ўсяляла і тое, што Марыя Захараўна — карэнная жыхарка вёскі. Нарадзілася ў Камсамольцы 80 гадоў таму. Праўда, тады вёска называлася Радацень. Такую ж назву мела і ў гады вайны.

— Калі аб'явілі, што немцы блізка, усе паўцякалі ў лес, — успамінае Марыя Чарнюк. — А я маленькая была ды схавалася ў кусты, што каля балота. Ляжу і чую, плюхаюць-плюхаюць па вадзе дзесьці побач. Думала, можа, сястра. Падняла галаву і пачала гукаць. А яны ўзялі і выстралілі... Не трапілі. Я — зноў у балота. А вады поўна-поўна. Доўга ляжала. Ужо і есці захацелася. А побач — нікога. Праляжала да самага вечара.

Яна толькі потым даведалася, што немцы ішлі паліць суседнія Ананчыцы. Быў 1944 год...

«Той, хто газеты друкаваў?»

Гэта адно з самых моцных узрушэнняў, якое ў яе, тады васьмігадовай дзяўчынкі, пакінула вайна. Калі, вядома, не лічыць таго, што з фронту не вярнуўся адзін з чатырох родных братоў. У вёсцы ж у асноўным было ціха. Вораг лютаваў дзесьці побач, а Камсамолец — тады Радацень — з'яўляўся невялічкім востравам бяспекі, акружаным лясамі.

Невыпадкова вёску аблюбавалі партызаны. Як успамінае Марыя Захараўна, партызанаў у іх была поўная хата. «Яны ў нас і жылі, і есці сабе варылі, — успамінае дзіця вайны. — Помню, ляжу малая на печы, а яны мяне смачненькім нечым частуюць. Такія харошанькія былі. І маці ім мая дапамагала: хлеб пякла, кругом усё рабіла».

Сярод партызанаў быў і Міхаіл Барашкаў. Хутчэй за ўсё, іншыя партызаны таксама былі задзейнічаны ў стварэнні або распаўсюджванні газет.

— Вы помніце Барашкава? — пытаюся ў Захараўны.

— А хто яго ведае! Гэта той, хто газеты друкаваў, ці што?

Але тое, што ў яе хаце некаторы час ствараліся газеты «Звязда» і «Чырвоная змена», жанчына памятае добра. Хоць, прызнаецца, самі газеты, якія выходзілі тады з-пад друкарскага станка, яна ніколі не бачыла.

Як яшчэ распавяла гаспадыня, шыльда на яе хаце вісіць сімвалічна. Гэты дом пабудавалі ў 1970-х гадах — такім чынам дзяржава вырашыла аддзячыць сям'і за дапамогу партызанам. Тая хата, дзе сапраўды выдаваліся «Звязда» і «Чырвоная змена», стаяла побач. Пасля вайны з яе зрабілі хлеў.



Побач з Міхаілам Барашкавым пахаваны два невядомыя партызаны.

Тыф-забойца

Тое, што падчас вайны ў вёсцы сапраўды размяшчаліся партызаны мінскага падпольнага злучэння, у свой час пацвярджала і мясцовая жыхарка Марыя Стасеня.

Вось што яна расказвала: «У 1944 годзе з-пад Скаўшына прыбылі партызаны, сярод якіх Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў. Гэта быў высокі чалавек з вялізным чубам. Партызаны часта выходзілі на заданні. У той час лютавала страшная хвароба — тыф. Хутка захварэў і Міхаіл Парфёнавіч. Даглядала я яго разам з Соф'яй Самусевіч і Аленай Мухай. Мы па чарзе былі каля хворага. Заходзілі і яго памочнікі: Ніна Цылько, Мікола Курыка, Емяльян Шурпач. На вялікі жаль, Міхаіла Парфёнавіча не стала. Хутка і я захварэла на тыф. Ледзь выжыла...»

Друкарскі станок на ўспамін

Марыя Іосіфаўна таксама ўспамінала, што на магілу Барашкава неаднойчы прыязджалі з Мінска яго паплечнікі. Нават захоўвала фотаздымкі тых сустрэч.

Марыя Захараўна ЧАРНЮК была яшчэ дзіцем, калі ў яе хаце ствараліся падпольныя газеты «Звязда» і «Чырвоная змена».

Не раз тут была і жонка Міхаіла Парфёнавіча. Яе добра памятае жыхарка вёскі Доўгае Таццяна Хаміцэвіч, дзяцінства якой прайшло ў Камсамольцы.

— Я тады ў школу хадзіла, — успамінае жанчына. — Жонка Барашкава пастаянна прыязджала. Помнік гэты ўвесь час фарбавала. Калі не магла прыехаць, тэлефанавала ў школу, і магілкі тыя прыбіралі мы. Самі плялі з дзеразы вянкі, рабілі кветкі. За гэта нас жонка Барашкава не раз частавала цукеркамі. Пастаянна гасцінцы вазіла. Мо з Мінска прыязджала ці адкуль? Кажуць, што яшчэ гады тры таму тут была. Праўда, ужо вельмі старэнькая.

Добра памятае Таццяна Хаміцэвіч і друкарскі станок, які застаўся ў Чарнюкоў у напамін аб вайне і партызанах. Жанчына даводзіцца сваячкай Марыі Захараўне, таму ў хаце, дзе ствараліся падпольныя газеты, бывала не раз.

— Гэта ў іх цяпер хата новая, — тлумачыць жанчына. — Тады была маленькая драўляная — адным словам, звычайная вясковая хата. І там станок стаяў. Такі вялізны, квадратны *(паказвае)*. Лістоўкі там ляжалі: адны надрукаваныя, іншыя ад рукі напісаныя. Помню, бегалі па вуліцы і махалі гэтымі лістоўкамі. І ўвесь час прасілі бабульку, якая там жыла: «Пакажы, дзе газеты малююць». Хто яго ведае, куды потым той станок знік...

Пахаваны пад хвоямі

Марыя Чарнюк, у хаце якой друкаваліся падпольныя газеты, таксама перанесла тыф. Яе маці з хваробай не справілася: хутка пасля вайны і памерла.

— Многа тады партызанаў пахварэла, — успамінае Марыя Захараўна. — Як даведаліся, што побач немцы, ужо знясіленыя, паўцякалі ў лес. Тут, у лесе, літаральна за нашым агародам, некаторыя і паўміралі. Хавалі іх ужо пасля вайны.

Свайго рэдактара і старэйшага таварыша журналісты-падпольшчыкі пахавалі адразу. Вось што пра апошнія дні яго жыцця напісаў супрацоўнік падпольнай і мірнай «Звязды» Емяльян Шурпач: «Прыйшла бяда — у сыпным тыфе звалiўся рэдактар. Доктар С.М. Шавец сказаў, што Барашкава не адолеў бы тыф. Але ў яго на грудзях была рана, атрыманая яшчэ на фронце. Аслаблены арганізм рэдактара не вынес. І на дзявятыя суткі хваробы Міхаіла Парфёнавіча не стала. Пахавалі яго пад трыма хвоямі, якія раслі на ўскрайку вёскі...»

Пад тымі самымі хвоямі, якія і сёння берагуць вечны сон адважнага партызана і таленавітага рэдактара, а таксама яшчэ дваіх, хто таксама змагаўся за мірнае неба над сваёй Айчынай.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Салігорскі раён

Аўтар выказвае падзяку начальніку аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Салігорскага райвыканкама Ларысе Жукавай і галоўнаму спецыялісту сектара культуры аддзела Ганне Носавай, а таксама старшыні Доўгаўскага сельскага Савета Уладзіміру Дрыviле і Мікалаю Хаміцэвічу, нашаму падпісчыку, за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.

Рэдактар «Звязды»-партызанкі Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў пахаваны на ўскрайку вёскі Камсамолец.

КАБ МЫ БЫЛІ ЗДАРОВЫМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Клініка асвоіла звыш 20 відаў высокатэхналагічных методык дыягностыкі і лячэння. На платнай аснове любы ахвотны можа абследавацца «ад і да». Вам трэба прайсці эндаскапічнае абследаванне? Не бойцеся і не цягніце! Эндаскапічнае абсталяванне ў «дзясятцы» — адно з найлепшых у краіне. Да таго ж тут працуюць галоўныя пазаштатныя гастраэнтэролаг і эндаскапіст Міністэрства аховы здароўя.

Развіццё сучаснай хірургіі дазваляе выконваць аперацыі, якія яшчэ не так даўно здаваліся фантастыкай. Калі раней, каб вылечыць пацыента ад цяжкага захворвання, трэба было выдаліць увесь орган, то сёння можна максімальна захаваць і орган, і якасць жыцця. Калі ў сасудах сэрца выяўляецца паталогія, то ў межах аднаго ўмяшання ставіцца ўжо некалькі стэнтаў.

Задача падобных бальніц — узяць на сябе асноўную нагрузку, звязаную з лячэннем самых распаўсюджаных паталогій. Аорта-каранарнага шунціравання тут не выконваюць (для гэтага ёсць РНПЦ «Кардыялогія»), аднак пацыенту з інфарктам міякарда робяць каранараграфію (для гэтага ёсць спецыяльны апарат — ангіёграф), падчас якой аднаўляецца парушаны крываток. Праз некалькі тыдняў пасля лячэння можна ўжо вяртацца да працы. Галоўнае — не забыцца пасля выпіскі выконваць рэкамендацыі ўрача і весці здаровы лад жыцця.

Ёсць і самае неабходнае для рэабілітацыі — вельмі актуальная тэма ў сучаснай медыцыне. Правесці аперацыю, як той казаў, палова справы. Аднавіць страчаныя функцыі, вярнуць пацыента да працы і звыклага жыцця — вось задача, якую вырашае сучасная медыцына.

З 2011 года ў 10-й быў адкрыты аперацыйны блок для фемтасекуднага эксімернага лазера, і ўпершыню ў сістэме дзяржаўнай аховы здароўя Беларусі пачалося выкананне карэкцыі зроку па методыцы LASIC. Пасля рэарганізацыі амбулаторных афтальмалагічных аддзяленняў, атрыманне новага дыягнастычнага і лячэбнага абсталявання былі асвоены самыя сучасныя методыкі лячэння захворванняў вачэй, у тым ліку перасадка рагавіцы.

З адкрыццём у 2014-м гастраэнтэралагічнага кансультатыўна-дыягнастычнага кабінета і атрыманнем новага дыягнастычнага, эндаскапічнага, ультрагукавога абсталявання клініка стала цэнтрам па дыягностыцы і лячэнні захворванняў страўнікава-кішачнага тракту, у тым ліку рэдкіх захворванняў абмену рэчываў, пачала ўдзельнічаць у шэрагу міжнародных клінічных выпрабаванняў.

У лютым мінулага года пасля капітальнага рамонту, поўнага перааснашчэння пачалі працаваць аддзяленні анестэзіялогіі і рэанімацыі, хірургічны аперацыйны блок. Цяпер клініка мае самы сучасны аперацыйны блок, што дазваляе выконваць увесь спектр хірургічных і афтальмалагічных аперацый у няспынным рэжыме. Два аддзяленні анестэзіялогіі і рэанімацыі маюць найноўшае абсталяванне, якое адпавядае патрабаванням па лячэнні пацыентаў усіх профіляў.

На базе бальніцы вядуць навуковую і вучэбную дзейнасць 9 кафедраў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі: 1-я кафедра хірургічных хвароб, 1-я кафедра ўнутраных хвароб медуніверсітэта, афтальмалогіі, псіхатэрапіі і медыцынскай псіхалогіі, рэфлексатэрапіі, эндакрыналогіі, неадкладнай хірургіі, гастраэнтэралогіі і нутрыцыялогіі, цыкла алергалогіі і прафпаталогіі кафедры герыятрыі БелМАПА, клінічнай лабараторыі прафпаталогіі і алергалогіі РНПЦ гігіены. Цесная ўзаемасувязь практычнай работы і навуковай дзейнасці спрыяе пастаяннаму павышэнню кваліфікацыі ўрачоў, дазваляе медыцынскім спецыялістам атрымаць добрую практычную і тэарэтычную падрыхтоўку, эфектыўна ўкараняць новыя медыцынскія тэхналогіі, метады дыягностыкі і лячэння.

10-я клініка разлічана на 1080 тэрапеўтычных і хірургічных ложкаў. 20 аддзяленяў з 39 маюць ложкавы фонд, астатнія 6 — амбулаторныя. Працуюць 278 урачоў і 568 медсясцёр. Сярод работнікаў — восем кандыдатаў медыцынскіх навук, дзевяць выдатнікаў аховы здароўя. 90 працэнтаў урачоў маюць кваліфікацыйныя катэгорыі.

У бальніцы арганізаваны 8 VIP-палат і 8 палат павышанага камфорту. Сёлета плануецца арганізаваць яшчэ 2 VIP-палаты. Праводзіцца работа па рэдызайне сайта, дзе размешчаны 3D-тур па медыцынскай установе. Аб экспартных магчымасцях можна даведацца на партале Belinfo.by.

Святлана БАРЫСЕНКА.

P.S. Шчыра віншуем з надыходзячым прафесійным святам — Днём медыцынскага работніка — усіх, хто мае да яго дачыненне! Зычым тым, хто дапамагае захоўваць здароўе сваім пацыентам, таксама заставацца здаровымі!

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

✓ Беларусь уваходзіць у лік 50 лепшых краін свету па вядзенні цяжарнасці, арганізацыі родаў кваліфікаваным медперсаналам. Усе роды адбываюцца ў нас ва ўмовах стацыянараў. Паказчыкі дзіцячай і мацярынскай смяротнасці — на ўзроўні развітых краін.

✓ Колькасць кардыяхірургічных умяшанняў у краіне летась дасягнула 17 тысяч. Праведзена 5 858 аперацый эндапратэзавання тазасцегнавых і 1 249 каленных суставаў.

✓ Летась было выканана 35 аперацый па трансплантацыі сэрца, 69 — печані, 324 — нырак і. Па колькасці трансплантацый на 1 млн жыхароў краіна заняла 1-е месца сярод краін СНД. Паспяхова выконваюцца перасадкі ствалавых клетак і тканак — рагавіцы, скуры, касцявой тканкі.

✓ Фактычна зведзена да мінімуму колькасць грамадзян, якія накіроўваюцца на лячэнне за мяжу, а беларускія медыкі аказваюць свае паслугі замежным грамадзянам, якія прыязджаюць на лячэнне ў нашу краіну.

✓ Знакавай падзеяй летась стала адкрыццё малекулярна-генетычнай лабараторыі канцэрагенезу і цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. Абсталяванне ПЭТ-цэнтра дазваляе праводзіць раннюю дыягностыку анкалагічных, неўралагічных і кардыялагічных захворванняў, прызначаць дакладную схему лячэння, выбіраючы для кожнага пацыента лекі, якія найбольш яму падыходзяць.

✓ У сістэме аховы здароўя працуюць каля 40 тысяч урачоў, з якіх больш за 70 працэнтаў маюць кваліфікацыйныя катэгорыі. Колькасць сярэдняга медперсаналу — амаль 114 тысяч чалавек.

■ Нечаканы ракурс

«ДЗЕЦІ НЕ ХОЧУЦЬ НАСІЦЬ АКУЛЯРЫ»

Амаль кожны трэці вясковы школьнік мае праблемы са зрокам

Дабрачынны праект «Я бачу!» падвёў першыя вынікі. З сакавіка гэтага года афтальмолагі агледзелі 4,8 тысячы дзяцей з сельскай мясцовасці ў Магілёўскай вобласці. Розныя паталогіі зроку знайшлі ў 29 працэнтаў школьнікаў. Прычым у 17 працэнтаў агледжаных гэтыя адхіленні выявілі ўпершыню.

Праект па дыягностыцы і аказанні афтальмалагічнай дапамогі вясковым школьнікам праводзяць Беларускі дзіцячы фонд і кампанія Velcom пры падтрымцы Магілёўскага аблвыканкама. Расказваючы пра актуальнасць мерапрыемства, **дырэктар фонду Аляксандр ТРУХАН** прыводзіць статыстыку: па звестках Міністэрства аховы здароўя, у структуры дзіцячых захворванняў праблемы зроку стаяць на другім месцы. Да таго ж у сельскіх хлопцаў і дзяўчат менш магчымасцяў атрымаць належную медыцынскую дапамогу. У некаторых раёнах Магілёўшчыны на 30-60 тысяч дарослага і дзіцячага насельніцтва прыходзіцца толькі адзін афтальмолаг. А ў шасці раёнах вобласці профільнага спецыяліста ўвогуле няма.

Медыкі прызнаюцца, што былі шакіраваны сітуацыяй у вёсках.

— Да пачатку праекта мы думалі, што тэхнічны прагрэс там не так развіты, як у горадзе, таму ў сельскіх дзяцей павінна быць значна менш праблем са зрокам. Але працэнт паталогій для вёскі аказаўся велізарны, — адзначае **ўрач-афтальмолаг Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы Марыя МАЛАШКА**. Для параўнання: у гарадах праблемы са зрокам маюць 45 працэнтаў школьнікаў.

Калі разглядаць структуру захворванняў вачэй, то часцей за ўсё сустракаецца блізарукасць (яе выявілі ў 15 працэнтаў агледжаных). На другім месцы астыгматызм (гэта паталогія назіралася ў 189 школьнікаў), на трэцім — дальназоркасць (у 142 чалавек). Яшчэ ў 1,5 працэнта дзяцей дыягнаставалі касавокасць.

Сярод хлопцаў і дзяўчат са зніжанай вастрынёй зроку амаль палова мела патрэбу ў акулярнай карэкцыі, усяго выпісалі 680 акуляраў. Сем дзяцей адправілі на аперацыі, 18-ці прызначылі кансерватыўнае лячэнне ва ўмовах стацыянара. Дзевяць школьнікаў накіравалі ў Магілёўскую абласную бальніцу для паглыбленай дыягностыкі, яшчэ 19 запісалі на шпіталізацыю ў аддзяленне афтальмалогіі для канчатковага ўдакладнення дыягназу.

У некалькіх выпадках брыгада ўрачоў сутыкалася з сур'ёзнымі захворваннямі. Так, калі медыкі прыехалі ў Расненскую дапаможную школу-інтэрнат (Дрыбінскі раён), адзін з яе вучняў хадзіў з павязкай на воку. Высветлілася, што тры дні таму 11-гадовы хлопчык, гуляючы, трапіў сабе ў вока гумкай. Мясцовыя ўрачы аказалі дзіцяці толькі першую дапамогу: закапалі альбуцыд і сказалі, што праз пару дзён усё адновіцца. Мабільная ж брыгада адразу шпіталізавала школьніка. Калі б гэта не было зроблена своечасова, магла б пачацца язва рагавіцы, што прывяло б да слепаты.

У вёсцы ні школьнікі, ні іх бацькі не лічаць зніжаны зрок праблемай, заўважае Марыя Малашка. «Яны не надаюць гэтаму значэння. Хоць падлеткі ў 15-16 гадоў у стане ацаніць, што бачаць горш. У школьнікаў няправільныя адносіны да акулярнай карэкцыі: дзеці лічаць, што гэта непрыгожа і непатрэбна».

Спецыяліст дадае, што прафілактычныя агляды прадугледжаны не проста так — яны дазваляюць выявіць паталогіі. Некаторыя праблемы адразу не адбіваюцца на якасці зроку, таму без дыягностыкі іх складана заўважыць. Так, калі дзіця скардзіцца на галаўны боль, стомленасць, вяласць — гэта могуць быць першыя прыкметы блізарукасці. Падобныя сімптомы ўзнікаюць, таму што мышца, якая адказвае за зрок удалячынь і зблізку, пастаянна напружана. Каб не прапусціць паталогію, афтальмолагі раяць школьнікам праходзіць дыягностыку раз на год.

Сабраць грошы на праект «Я бачу!» дапамагла кампанія Velcom. У снежні мінулага года мабільны аператар правёў дабрачынную акцыю: на працягу 17 дзён з кожнага смартфона і планшэта, купленага ў фірменных цэнтрах продажу і абслугоўвання ці ў інтэрнэт-краме, арганізацыя пералічала 50 тысяч рублёў са свайго прыбытку на спецыяльны рахунак. Каля 36 тысяч чалавек паўдзельнічала ў гэтай ініцыятыве. У выніку было сабрана 1,8 мільярда рублёў. На гэтыя грошы набылі спецыяльнае аўто і мабільнае афтальмалагічнае абсталяванне, аплацілі працу ўрачоў брыгады.

«Да пачатку праекта мы думалі, што тэхнічны прагрэс там не так развіты, як у горадзе, таму ў сельскіх дзяцей павінна быць значна менш праблем са зрокам. Але працэнт паталогій для вёскі аказаўся велізарны».

Праект ужо ахапіў восем раёнаў: Бялыніцкі, Дрыбінскі, Кіраўскі, Клімавіцкі, Клічаўскі, Касцюковіцкі, Краснапольскі і Круглянскі. У верасні стартуе другі этап акцыі. Да канца года ўрачы плануюць агледзець яшчэ дзесяць тысяч вясковых дзяцей у 11 раёнах Магілёўскай вобласці. Арганізатары спадзяюцца, што ў будучым змогуць ахапіць і іншыя рэгіёны. Па словах **начальніка аддзела карпаратыўных камунікацый Velcom Вячаслава СМІРНОВА**, кампанія гатова і далей падтрымліваць праект.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Мінская вобласць, Маладзечанскі раён

У культурнай сталіцы і эканоміка развіваецца

Сёлета Маладзечна атрымала статус «Культурнай сталіцы Беларусі». І гэта — не аванс, а аб'ектыўнае прызнанне таго, што ўжо зроблена мясцовымі ўладамі для развіцця горада. Сёння Маладзечна — невялікі еўрапейскі горад з развітой інфраструктурай, турыстычнымі славутасцямі, разнапланавымі варыянтамі культурнага адпачынку, вялікай колькасцю паспяховых прадпрыемстваў. Але зроблена яшчэ не ўсё магчымае, упэўнены старшыня Маладзечанскага райвыканкама Аляксандр ЯХНАВЕЦ. У раёна на наступныя пяць гадоў працы ёсць канкрэтныя прапановы па паляпшэнні ўмоў жыцця яго жыхароў.

— Асаблівасцю мінулай пяцігодкі для нас стала тое, што яе пачатак супаў з падрыхтоўкай і правядзеннем у раёне рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2011». Той год для кіруючага саставу, спецыялістаў усіх узроўняў улады стаў свайго роду іспытам, які быў паспяхова вытрыманы, — лічыць глава райвыканкама.

Па яго словах, для эканомікі Маладзечанскага раёна, як і краіны ў цэлым, апошнія два гады складваліся вельмі напружана пад уплывам, перш за ўсё, знешніх фактараў. А гэта адмоўна адбілася на выкананні пяцігадовага плана. Але дзякуючы зачынам першых трох гадоў пяцігодкі раёну ўдалося выйсці на канец пяцігодкі на наступныя тэмпы росту: па прадукцыі прамысловасці — на 118,2%, прадукцыі сельскай гаспадаркі — 124,5%, экспарце паслуг — 263,4%. За мінулыя пяць гадоў рэальная заработная плата ў раёне выраслa ў 1,4 раза. А па выніках работы за 2012 год Маладзечанскі раён занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару.

«Цяпер эканоміку раёна фарміруюць 40 асноўных прадпрыемстваў. З іх 14 — узроўню рэспубліканскага падпарадкавання, 10 — камунальныя, у падпарадкаванні мясцовых Саветаў дэпутатаў, і 16 — юрыдычныя асобы без ведамаснай падпарадкаванасці», — **расказвае Генадзь АКТАНАРОВІЧ,** намеснік старшыні Маладзечанскага райвыканкама па эканамічных пытаннях. Нягледзячы на негатыўнае ўздзеянне на фінансавае становішча нашай краіны знешніх фактараў, 24 прадпрыемствы ці 60% з вытворчасцяў раёна ў першым квартале спрацавалі вышэй леташняга ўзроўню. Астатнія 16 пакуль не дасягнулі мінулагодніх паказчыкаў, але, мяркуе намеснік старшыні райвыканкама, па выніках за першае паўгоддзе і за год, колькасць такіх зменшыцца.

— Мінулы год для нас быў, на жаль, няўдалым, але ў параўнанні з 2014 годам статыстыка паказвае рост паказчыкаў, — кажа Генадзь Актанаровіч. — Такія рэспубліканскага ўзроўню падпарадкавання прадпрыемствы, як «Электрамодуль», «Беразінскае», «Белмастацкераміка», «Маладзечанскі хлебазавод», па даных за першы квартал 2016-га, працуюць устойліва і паступова нарошчваюць аб'ёмы вытворчасці. Сярод камунальных хочацца адзначыць «Водаканал», «Дарвектар-Маш», «Маладзечанскі малочны камбінат». Апошні мае страты, але нарошчвае аб'ёмы вытворчасці. А «Маладзечанскі камбінат хлебапрадуктаў», які ў мінулым годзе правёў мадэрнізацыю, сёння паспяхова рэалізуе выраблену прадукцыю. Сярод прадпрыемстваў бязведамаснага падпарадкавання добра спрацавалі «Мінскі мэблевы цэнтр», «ЭНЭФ», «Амазон-Каларыт», «Дзіліс Касметык», «Велес-Міт», «Механічны завод» і інш. У апошнія гады развіваецца і прадпрыемства «БелТІЗ» Таварыства інвалідаў па зроку. Традыцыйна прыбыткова працуе «Юлайн», які займаецца мясаперапрацоўкай і вырабам паўфабрыкатаў.

Па словах намесніка старшыні райвыканкама, у першым квартале быў перавыкананы паказчык па экспарце тавараў (173,1% да ўзроўню мінулага года) і паслуг (116,9%). «Над астатнімі паказчыкамі працуем. Думаю, што па выніках за першае паўгоддзе яны палепшацца, а напрыканцы года ўсе даведзеныя паказчыкі будуць выкананыя: і па колькасці створаных працоўных месцаў, і па вытворчасці валавой прадукцыі для сельскай гаспадаркі, і па рознічным тавараабароце», — лічыць Генадзь Актанаровіч.

Адным з галоўных дасягненняў прадпрыемстваў раёна з'яўляецца і тое, што за апошні год атрымалася нарасціць аб'ём вытворчасцяў. «Сумеснымі намаганнямі з Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва і Саветам Міністраў Беларусі атрымалася загрузіць Маладзечанскі завод металаканструкцый, — дзеліцца інфармацыяй намеснік па эканамічных пытаннях. — У прадпрыемства сёння ёсць праблема — закрэдытаванасць. Але галоўнае, што людзі загружаныя, работа ідзе, і тысяча чалавек адшукалі такім чынам работу».

За апошнія пяць гадоў у раёне таксама ўведзеныя ў эксплуатацыю і сацыяльна значныя аб'екты: спартыўна-забаўляльны цэнтр, яслі-сад на 230 месцаў, пляцоўкі для пляжнага валейбола ў гарадскім парку імя Перамогі, Чысцінскі сельскі Дом культуры, завершаны капітальны рамонт і рэканструкцыя дзіцячай бальніцы і бальніцы №2. Цяпер працуе і амфітэатр у Маладзечне на 2600 пасадачных месцаў, паведаміла Алеся ЛУКОЎСКАЯ, загадчык аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маладзечанскага райвыканкама.

Па словах главы выканкама Аляксандра Яхнаўца, у планах на бліжэйшы час — пераадоленне тых негатыўных тэндэнцый у эканамічнай сферы, якія пакуль не атрымалася пераламіць. «У эканамічнай сферы ў 2016 годзе варта звярнуць увагу на эфектыўную занятасць людзей, зніжэнне выдаткаў на вытворчасць і рэалізацыю тавараў, укараненне інвестыцый і новых праектаў, якасць прадукцыі, развіццё дзяржаўнага сектара і прыватнага бізнесу», — лічыць ён.

— Дынамічнае развіццё аховы здароўя, прыцягненне насельніцтва да здаровага ладу жыцця, якасная адукацыя, развіццё культуры — фактары, якія будуць забяспечваць годны ўзровень жыцця нашага насельніцтва. У бліжэйшыя пяць гадоў мы будзем імкнуцца да рэалізацыі ўсяго назапашанага станоўчага вопыту, максімальнай аддачы, арганізаванасці, дысцыплінаванасці кожнага чалавека на вытворчасці, — упэўнены Аляксандр Яхнавец. — Бо ад гэтага непасрэдна залежыць дабрабыт усяго раёна.

■ Фестываль

ІНСТРУМЕНТ З ДУШОЙ

У Маладзечанскай дзіцячай школе мастацтваў ужо стала прапісаўся фестываль-конкурс «Свята саксафонаў». Падзея, унікальная для постсавецкай прасторы. Падобнага кшталту мерапрыемствы праводзіліся раней у асобных гарадах Расіі, але былі з'явай разавай. А ў беларускім горадзе на Ушы фестываль праводзіцца ўжо трэці раз. Праўда, сёлета — пазапланава (звычайна — раз на два гады) з нагоды Года культуры і атрымання Маладзечнам звання культурнай сталіцы.

«Звязда» наведала фестываль і трапіла на выступленне Аляксея ІАРДАСОПАВА.

— Мяне цешыць тое, што з кожным разам наш фестываль пашыраецца і адшуквае новых прыхільнікаў, — расказвае **Уладзімір Яцыновіч, дырэктар школы мастацтваў.** — У нас па

заяўках прадстаўлены ўсе вобласці краіны. Я, праўда, і расійскі Смаленск запрашаў паўдзельнічаць, але, на жаль, не атрымалася. Але мы працуем над тым, каб конкурс выйшаў на міжнародны ўзровень і да нас завіталі саксафаністы з іншых краін.

Тое, што фестываль прысвяцілі менавіта саксафону — не дзіва. «Я люблю гэты інструмент за яго душу і лічу, што ён можа падкупіць любога слухача: унікальным тэмбрам, тэхнічнымі магчымасцямі», — расказвае дырэктар. У свой час менавіта таму Уладзімір Яцыновіч пачаў іграць на саксафоне, што пачуў майстэрскае выкананне на ім і закахаўся ў гучанне. І пасля стаў заўважаць, што сімпатыю да інструмента падзяляе большасць слухачоў: саксафон карыстаецца найбольшай папулярнасцю ў публікі.

З кожным годам павялічваецца не толькі колькасць удзельнікаў фестывалю, але і прадстаўнічы ўзровень журы. Сярод іх — аўтарытэтныя музыканты як з Беларусі, так і з-за мяжы. Як, напрыклад, Уладзімір Мішула, заслужаны работнік мастацтваў Рэспублікі Польшча, дырэктар школы мастацтваў I і II ступені горада Бяла-Падляска. З айчынных — старшыня журы Барыс Ніч-коў, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, доктар мастацтвазнаўства Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, член саюза музычных дзеячаў Рэспублікі Беларусь, а таксама Валерый Грыгарук і Марцэлін Дабравольскі. «Што аб'ядноўвае членаў журы — кожны з іх калісьці працаваў у Маладзечне», — дзеліцца дырэктар.

Яшчэ адна адметная рыса фестывалю — удзел у конкурсе бяруць не толькі прадстаўнікі мастацкіх школ, але і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі і ВНУ. Атрымліваецца своеасаблівы зрэз узроўню майстэрства ігры на саксафоне: ад самых маленькіх (ад 1-га класа) і да без дзвюх хвілін прафесіяналаў. Галоўнае — «Свята саксафонаў» абвяргае звыклы стэрэатып: гэта рэдкі выпадак, калі з усіх рэгіёнаў удзельнікі сцякаюцца не ў сталіцу Беларусі, а ў яе раённы горад — Маладзечна

■ Дзецям

ПРАСТОРА ДЛЯ ТВОРЧАГА РОСТУ

Будынак і тэрыторыя побач з дзіцячым цэнтрам культуры «Расток» горада Маладзечна больш нагадвае загарадную сялібу, чым месца для заняткаў дзяцей. Сярод клумбаў, дрэў, зялёнага газона месціцца некалькі невысокіх збудаванняў, у якіх дзеці вучацца танцаваць, спяваць, маляваць, рабіць уласнаручна падарункі блізкім і ўпрыгожванні для дому.

Наталля СОНІЧ, дырэктар «Растка», і Жанна КУЛАКОЎСКАЯ, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маладзечанскага райвыканкама, разглядаюць апошнія дыпломы студыі «Брава».

— У цэнтры зараз працуюць 22 аматарскія фарміраванні. Ёсць народныя студыі выяўленчага мастацтва «Чароўная палітра», гумарыстычны гурт «Тары-бары» і ўзорная студыя эстрадных спеваў «Брава». Таксама ёсць і вакальны калектыў цэнтра «Талака», які карыстаецца найбольшай папулярнасцю, — расказвае пра «Расток» яго дырэктар Наталля СОНІЧ.

Калектыў цэнтра — усяго 33 чалавекі, з якіх 20 — творчыя работнікі. Нягледзячы на невялікую колькасць супрацоўнікаў, у цэнтры штогод ладзіцца каля 200 творчых праектаў. «Напрыклад, у Маладзечне раней было мала мерапрыемстваў для дашкольнікаў, таму чатыры гады таму мы правялі конкурс для самых маленькіх дзетак 4-6 гадоў «Капітошкі», бо ў апошнія гады расце колькасць дзяцей, якія займаюцца ў творчых студыях ранняга развіцця.

(Заканчэнне на 10-й стар.)

■ Незвычайныя — побач!

МАЛАДЗЕЧАНСКІЯ ЛЫЖАЧНІКІ

Калісьці ў Маладзечна на «Дажынкі», якія адбыліся ў 2011 годзе, завіталі нясвіжскія лыжачнікі. Вольга ХАЗІКАВА, дырэктар гімназіі-каледжа мастацтваў Маладзечна, пабачыўшы іх выступленне, прапанавала зладзіць у сваёй школе падобны калектыў. Ідэю падхапілі. Так і з'явіўся на свет ансамбль, у якім адзіныя інструменты — гэта спецыяльна выраблены лыжкі, і фантазія тых, хто на іх іграе.

У інтэрнэце відэа з выступленнямі калектыву маюць па некалькі тысяч праглядаў. Большасць з іх з загалоўкамі накшталт «Лыжачнікі парвалі залу!». Сапраўды, удзельнікі гурта не абмяжоўваюцца звычайнай ігрой на лыжках, а ладзяць цэлыя шоу і паўнавартасныя сцэнічныя нумары, ад якіх публіка прыходзіць у захапленне.

— У нашу гімназію часта аддаюць дзетак сарамлівых — у тэатральны клас, каб разняволіліся, неўтаймаваных — у музычны, каб навучыліся ўседлівасці, — расказвае дырэктар установы. — Да лыжачнікаў ідуць тыя, каму цяжка даецца ўлоўліваць рытм.

(Заканчэнне на 10-й стар.)

ПРАКОЦІМСЯ З ВЕТРЫКАМ

Першае, што мы бачым, прыехаўшы ў Маладзечна на аўтобусе, — так званыя вароты горада, вакзал. Ён не горшы, чым у Мінску: электроннае табло, зручныя крэслы ў зале чакання, тэрміналы для набыцця квіткоў, выявы турыстычных славутасцяў горада. Аўтавакзал належыць аўтобуснаму парку №4 г. Маладзечна, адзінаму філіялу ў структуры «Мінаблаўтатранса» з трыма аўтавакзаламі. Сёння аўтапарк ажыццяўляе перавозкі як унутры Беларусі, так і за яе межамі. Пра гэта і тое, у якім кірунку плануе развівацца прадпрыемства, расказаў дырэктар аўтапарка Уладзіслаў УСЦЮШЭНКА.

— Якія ў прадпрыемства асноўныя накірункі працы?

— Сёння амаль любое транспартнае прадпрыемства працуе ў дзвюх сферах: пасажырскія і грузавыя перавозкі. З улікам знешніх фактараў, калі эканоміка краіны перажывае не самыя лепшыя часы, то на першым накірунку гэтыя працэсы адбіваюцца перш за ўсё. У апошнія месяцы назіраецца падзенне пасажыраабароту амаль на 20%. Людзі сталі ездзіць менш, эканоміць больш.

Мы адзінае прадпрыемства, якое ўваходзіць у структуру «Мінаблаўтатранса» і валодае трыма аўтавакзаламі. Абслугоўваем Маладзечанскі і Мядзельскі раёны. Дзякуючы ўзроўню дапамогі мясцовых улад, своечасовасці выплат датацый (бо такія кірункі, як пасажырскія гарадскія і прыгарадныя перавозкі, прыбыткаў не прыносяць) прадпрыемства трымаецца на плыву.

Грузавы аўтапарк таксама адчувае праблемы, бо пры скарачэнні рынку транспартных паслуг падчас крызісу тыя прыватныя перавозчыкі, якія былі нябачныя для нас раней, цяпер далучыліся і да нашых ніш працы. Яны выйшлі на рынак з больш нізкімі цэнамі, бо не маюць той надбудовы,

што аўтапарк. Сёння іх цэны амаль у два разы меншыя, чым нашы, і таму ў гэтай сферы мы нясём страты амаль па ўсіх кірунках. Аднак у апошні час палепшыўся стан з міжнароднымі грузавымі перавозкамі, дзе працуюць 7 машын: 3 новыя МАН 2014 года і 4 IVECO 2008 года.

— Міжнародны кірунак перавозак сёння прыбытковы?

— Так. Што тычыцца пасажырскіх перавозак, то здзяйсняем мы не толькі гарадскія і прыгарадныя, але і міжнародныя перавозкі. У турыстычны сезон пастаянна ладзім туры ў Еўропу: краіны Балтыі, Балканы, у Іспанію, Партугалію, Германію. Круглы год нашы аўтобусы ездзяць у гарады Расіі. Зараз думаем аднавіць працу з Украінай.

Грузавыя міжнародныя перавозкі адбываюцца ў Еўропу, краіны Балтыі, Данію, Германію, Венгрыю, Румынію, Расію, Казахстан. У вялікім аб'ёме ўдзельнічаем у будаўніцтве 2-й Мінскай кальцавой аўтадарогі. Сённяя праца на ёй складае 80% выручкі ад нашай самазвальнай тэхнікі.

Увогуле прадпрыемства мае ў рухомым саставе 133 аўтобусы і 61 грузавік. Частку пасажырскага транспарту плануецца абнавіць. Па плане гэтага года Маладзечанскі раённы выканаўчы камітэт плануе дапамагчы закупіць 8 аўтобусаў «ПАЗ» прыгараднага назначэння. Гэта значна палепшыць нашу сітуацыю, дазволіць правесці структурныя змены ў сабекошце, бо гэта транспарт малой змяшчальнасці і таму патрабуе менш паліва, чым звычайныя аўтобусы.

— Якія планы на гэты год?

— З мінулага года мы пачалі ўсталёўваць шматканальныя відэарэгістратары на прыгарадным транспарце. Па-першае, такім чынам мы дысцыплінавалі вадзіцеля і пасажыра з пункту гледжання фінансаў. Бо цяпер усе спрэчкі вырашаюцца прасцей, калі на запісе відаць, хто каму даў колькі грошай. Наша інфармацыя захоўваецца каля 2 месяцаў, а калі адбыўся інцыдэнт, то пастаянна. Па-другое, паколькі камера шматканальная, то яна сочыць і за салонам, і за дарогай. Усе дарожныя канфлікты, аварыі сталі прасцей вырашацца. Па-трэцяе, мы не тратім грошы на праверку пасажырапатоку, а вывучаем яго па відэазапісе. У нашых планах — усталяваць 46 відэарэгістратараў (ужо працуюць 36).

Ёсць планы і па мадэрнізацыі тэхнічнай часткі прадпрыемства. Плануем закупіць спецтэхніку і такім чынам выйсці на гэты новы для нас рынак паслуг. Напрыклад, маладзечанскае перапрацоўчае прадпрыемства ТАА «Вялес-Міт» мае пэўны попыт на жывёлавоз. Таксама плануем правесці рамонт майстэрняў, бо львіная доля абслугоўвання аўтатранспарту адбываецца там, а таксама збіраемся мадэрнізіраваць аўтамыйку. Магчыма, што ў сувязі з верагоднай рэструктурызацыяй «Мінаблаўтатранса», пасля якой аўтапарк можа стаць асобнай юрыдычнай адзінкай, больш мабільнай, планы зменяцца.

— Усе гэтыя дасягненні сталі магчымымі дзякуючы...

— Мне пашчасціла з калектывам, бо супрацоўнікі ў нас — майстры сваёй справы. Ёсць і тыя, хто ўсё жыццё адпрацаваў у аўтапарку. Сёння ў нас працуе 516 чалавек. З іх 212 — кіроўцы, 72 — кандуктары, у майстэрнях — 65 супрацоўнікаў. Калі я год таму ўзначаліў парк, 30% калектыву складалі пенсіянеры. Цяпер склад стаў больш «юным»: ва ўзросце да 40 гадоў працуе 38%, а дагэтуль было 28%. Прыходзяць да нас і маладыя спецыялісты, з іскрынкай у вачах і жаданнем працаваць. Два святы мы адзначаем разам: Новы год і наша прафесійнае — Дзень аўтамабіліста. Мне прыемна, што са мной працуюць такія людзі.

Вераніка СУШКО, аператар ПЭВМ.
Яе непасрэдная праца — кантроль за сістэмай відэарэгістрацыі:

— Я пяць гадоў адпрацавала кантралёрам-рэвізорам. Мая сённяшняя праца — такі ж кантроль, толькі ўжо ў рэжыме анлайн. Я прыходжу з раніцы, іду ў аўтобус і здымаю відэарэгістратар — вялікую флэшку, на якой запісваецца 14 дзён працы кіроўцы з 5 раніцы і да 11 вечара. Падключаю да камп'ютара, бяру квіткі, якія ён прадаў за гэты час, і праглядаю, каб не было выпадкаў, дзе вадзіцель раптам недадаў рэшту ці паводзіў сябе непаважліва.

Пасажыры, якія забылі рэчы ў салоне аўтобуса, звяртаюцца з заявай у міліцыю, а яна — да нас па запіс. На ім відаць усё, нават якія грашовыя купюры даюць адно аднаму пакупнік і кіроўца: відэа HD-якасці. І яшчэ часта цікавіцца Дзяржаўтаінспекцыя, бо ў відэарэгістратара тры камеры: у салоне, побач з вадзіцелем і з відам на дарогу. Таму ўсе супярэчлівыя моманты можна адсачыць.

З таго моманту, як усталявалі відэарэгістратары, з аднаго боку, вадзіцелі сябе сталі больш паважліва паводзіць у дачыненні да пасажыраў, а з другога, прызнаюцца, што і адчуваюць сябе спакайней. Яны могуць без перасцярогі пакінуць грошы ў салоне, бо перасталі адбывацца крадзяжы — усё запісваецца на відэа. Цяпер не бывае ніякіх боек, ніхто не распівае алкаголь у салоне. Калі людзі ведаюць, што за імі сочыць электроннае вока, то паводзяць сябе больш прыстойна. Цяпер у нас нават ёсць кіроўцы, якія спецыяльна просяць, каб ім далі аўтобус з відэарэгістратарам.

Кіроўцы ў аўтапарку штодзень праходзяць праверку на стан алкагольнага ап'янення. На фота — фельчар Ніна САМАЛЬ і кіроўца Яўген ВАСІЛЕЎСКІ.

У дыспетчарскай заўжды добрая атмасфера. На фота — Ірына СОДНІК, дыспетчар па грузавым аўтатранспарце, дыспетчар Вольга ЧУКОВІЧ і старшы дыспетчар Галіна ТРАПІШЧОНАК.

Вольга КАРАСТАЛЁВА, вядучы спецыяліст па турызме:

— У нас адны з самых прывабных коштаў у Маладзечне. У адрозненне ад іншых турыстычных фірмаў у сваім распараджэнні мы маем уласны транспарт, таму можам арганізоўваць паездкі для груп памерам ад 20 да 50 чалавек. Імкнёмся ва ўсім задаволіць кліентаў, таму, калі неабходна, распрацоўваем індывідуальныя маршруты, хоць прапануем і гатовыя. Цяпер, напрыклад, найбольшай папулярнасцю карыстаюцца туры выхаднога дня з экскурсіяй і шопінгам у Вільнюс, Смаленск і Беласток, Санкт-Пецярбург. Унутры Беларусі — гэта Гродна, Брэст, Мір — Нясвіж і Мінск — Мінская вобласць. У залежнасці ад грашовых магчымасцяў заказчыкаў прапаноўваем камфартабельныя айчынныя ці замежныя аўтобусы.

Для школьнікаў ці для карпаратыўнага адпачынку арганізоўваем выезд для гульні ў лазартаг, на скаладромы. Увогуле сённяшніх дзяцей музеем не здзівіш. Таму, напрыклад, падчас экскурсіі ў Мінск прапаноўваем наведаць музей Мінскага метрапалітэна, хімічнае шоу, пабачыць экзатычных жывёл. У Лідскім замку паўдзельнічаць у рыцарскім турніры, пастраляць з катапульты і патанцаваць сярэдневяковыя танцы. Мы заўжды прыслухоўваемся да пажаданняў кліентаў і імкнёмся іх выканаць, бо даражым кожным станоўчым водгукам і задаволеным турыстам!

Міхаіл ІЛЬКЕВІЧ, слесар-акумулятаршчык, працуе ў аўтапарку №4 амаль паўстагоддзя:

— У аўтапарку я працую з 8 лютага 1968 года. Таму, лічыце, 49-ы год пайшоў. Раней працаваў вадзіцелем. Вазілі экскурсіі, ездзілі начамі, зрок стаў падаць. Камісія да ваджэння дапускала, але я сам хваляваўся, таму з цягам часу перайшоў працаваць у майстэрню. І да сённяшняга моманту тут. Вядома, праца мне падабаецца, бо інакш чаму б столькі гадоў заставаўся на адным месцы?

Міхаіл ІЛЬКЕВІЧ з малодшым сынам Міхаілам.

Раней у аўтапарку былі зусім іншыя ўмовы працы: не было гарачай вады, сталовай, гардэроба, мікрахвалёўкі, халадзільніка. Раней прыйдзеш а палове чацвёртай раніцы, стаіць ледзяны аўтобус, рампы грэем... Цяпер усё больш механізавана, запчасткі і інструменты добрыя. Імі працаваць — адно задавальненне. Іншая справа, што мы прывыкаем да добрага і не заўжды гэта цэнім.

Памятаю, у 1980-м нас рыхтавалі да таго, што мы будзем абслугоўваць транспарт падчас летніх Алімпійскіх гульняў. Быў строгі інструктаж. Нават з КДБ прыязджалі, расказвалі, як сябе трэба паводзіць. Нам тады выдалі новыя касцюмы, далі новыя аўтобусы... Але амерыканцы байкатавалі Алімпіяду, і ў апошні момант усё адмянілі.

Я ўжо 10 гадоў як на пенсіі, але ўсё адно працую. Тут, дарэчы, і два мае сыны таксама. Ведаеце, гэта справа ладу жыцця: працаваць ці не, сумленна альбо абыякава ставіцца да справы, якую робіш. Усё залежыць ад самога чалавека.

УНП 601070223

СВЕЖАСЦЬ І ТРЫВАЛАСЦЬ НА НЕКАЛЬКІ ПАКАЛЕННЯЎ

ПАРЫЗАВАНАЯ КЕРАМІКА РАДАШКОВІЦКАГА КЕРАМІЧНАГА ЗАВОДА — СРОДАК «ВЫЛЕПІЦЬ» ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ ВАШАГА ДОМА

Інвестыцыі ў жыллё — пэўна, самы доўгатэрміновы і важны ўнёсак, які можа зрабіць кемлівы гаспадар. Дыхтоўны будынак паслужыць не аднаму пакаленню, калі пры яго стварэнні чалавек думае не толькі аб прыгажосці і кошце, але не забываецца на ўтульнасць, надзейнасць і бяспечнасць жыцця ў будучым доме. Каб атрымаць экалагічнае, трывалае і індывідуальнае збудаванне, патрэбен матэрыял, здольны спалучыць у сабе ўсе гэтыя ўласцівасці. Самы прывабны варыянт — кераміка, з якой створаны і старажытныя беларускія вежы, і сучасныя дзіцячыя садкі ды школы.

Керамічныя вырабы — традыцыйны матэрыял, з якога ў свеце ўжо не адно стагоддзе будуюць і шматпавярховікі, і прыватныя сядзібы. Уласцівасці керамікі гарантавана застануцца нязменнымі гадоў 150-200, а «пражывуць» будынкі яшчэ больш. Апроч доўгай службы, будынкі з парызаванага прадукту вылучаюцца сваёй экалагічнасцю — лепш дыхаецца толькі ў драўлянай хаце.

Дырэктар ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» Алег МІШЧАНКА.

— Дом будуецца не на год-два або дзесяць. Атрымаўшы імгненную выгаду ў момант будаўніцтва, чалавек не думае, што танны варыянт хутчэй сапсуецца і запатрабуе дадатковых грашовых укладанняў. Вельмі хутка яны перавысяць сэканомленыя зараз «капейкі», ператварыўшы іх у «рублі», — расказаў **Алег МІШЧАНКА, дырэктар ААТ «Радашковіцкі керамічны завод»,** разважаючы пра асаблівасці індывідуальнай будоўлі ў Беларусі. — Нашы суайчыннікі прызвычаіліся арыентавацца на тое, каб было, «як у суседа». У выніку часта атрымліваецца, што цэлыя пасёлкі ствараюцца не толькі з аднаго матэрыялу, а і па адным праекце. Гэта ўсё адно што аднолькава апранацца. Я прыхільнік эксклюзіўных варыянтаў дамоў, якія падкрэсліваюць індывідуальнасць іх гаспадара. Трэба ставіцца да жылля як да гістарычнай каштоўнасці, што сімвалізуе сувязь пакаленняў і спадчыннасць, замест таго каб імкнуцца да навізны і ўльтрасучасных збудаванняў, камфортны тэрмін жыцця ў якіх не дасягае нават паўстагоддзя. Беларусь — краіна прыроды, і ёй усё ж больш пасуюць будынкі з цэглы.

ЭКАНОМНЫЯ ЯКАСЦІ

Новая прадукцыя Радашковіцкага керамічнага завода — парызаваныя керамічныя сценавыя блокі — настолькі ўніверсальны матэрыял, што з іх, як з пластыліну, можна ствараць разнастайныя архітэктурныя формы ў розных стылях. Дзякуючы некалькім варыянтам памераў блокаў з іх можна рабіць як апорныя сцены, так і ўнутраныя перагародкі. Самы буйны памер блока — 9 NF (510x250x138 мм) — перавышае аб' ём звычайнага ў 9 разоў. А 2NF (250x120x138 мм), напрыклад, адпавядае па велічыні дзвюм звычайным цаглінам. Дзякуючы буйным памерам блокаў тэмпы кладкі будынка павялічваюцца ў два-тры разы. Праз выкарыстанне буйнафарматных керамічных блокаў у 12 разоў скарачаецца колькасць «масткоў холаду» ў сцяне.

Збудаваўшы дом з керамікі, не трэба чакаць, пакуль ён «усядзецца» — такога проста не адбываецца. Скончыўшы будоўлю, можна адразу прымацца за адстройванне дома і не непакоіцца, што праз некалькі гадоў прыйдзецца рамантаваць фасад. Будынак з керамікі можна аздабляць чым заўгодна: атынкоўваць або аблiцоўваць вонкавай ці клінкернай цэглай, фарбаваць. Для лепшага спалучэння з аддзелачнымі матэрыяламі блокі рабрыстыя па баках.

Карыстаючыся парызаванай керамікай, дарэчы, можна сэканоміць прыкладна 10—15% і пры канструяванні падмурка. Блокі важаць на 30% менш, чым звычайныя пустацелыя цагліны, таму не будуць ствараць моцны ціск на фундамент. Праз меншую вагу памяншаюцца таксама затраты на лагістыку. За адзін рэйс звычайна можна перавезці 7-8 тысяч звычайных цаглін, а керамічных — 11 тысяч. Сабекошт жыллёвых метраў пры гэтым таксама выйграе, бо цана блокаў прыкладна на 25% ніжэйшая, чым звычайных цаглін.

Акрамя таго, кераміка валодае нізкай цеплаправоднасцю — яна дазваляе захоўваць цяпло ў памяшканні ўзімку і ствараць прахалоду летам. Цепла- і гукаізаляцыя ў керамічнай «парызоўкі» ўдвая вышэйшая, чым у звычайных цаглін.

Прадпрыемства штогод удасканальвае якасць сваёй прадукцыі і мадэрнізуе тэхналагічнасць вытворчасці. За апошнія 10 гадоў тут абнавілі асноўныя ключавыя вузлы і наладзілі працу самага сучаснага абсталявання: швейцарскага, італьянскага, нямецкага, іспанскага, французскага — лепшага, што ёсць у еўрапейскіх вытворцаў.

Керамічныя цагліны вырабляюцца метадам пластычнага фармавання на французскай лініі фірмы CERIK, якая ўсталявала сваю прадукцыю на прадпрыемстве цалкам «пад ключ».

Уладзімір ЗАРОЎСКІ, вядучы інжынер па аўтаматызацыі сістэм кіравання, на фоне дома, які ён пабудаваў сваімі рукамі.

Да ўсіх пералічаных выйгрышных момантаў ад скарыстання прадукцыі радашковіцкага завода прадпрыемства дадае яшчэ адну вельмі важкую прычыну паспрабаваць гэты матэрыял у справе. Да канца чэрвеня фізічным асобам прапануецца набыць керамічныя блокі з 30-працэнтнай зніжкай. Пры гэтым іх кошт становіцца амаль такім жа, як у газасілікатных блокаў.

Увесь гэты час дзейнічае спецыяльная цана на транспарт: ад 10 тысяч рублёў за кіламетр. Сюды ўваходзіць і праца спецыяльнай машыны з маніпулятарам, якая разгрузіць матэрыял на аб'екце. Так што гаспадарам не прыйдзецца дадаткова наймаць кран. Прывоз на машыне без маніпулятара абыдзецца ўвогуле ад 8 тысяч рублёў за кіламетр.

— Такім чынам мы імкнёмся дапамагчы тым, хто хоча і сэканоміць, і атрымаць якасны прадукт. Паказаць, што выніковую выгаду трэба падлічваць зыходзячы не толькі з цаны матэрыялу, а з канчатковай цаны на аб'екце будоўлі, — патлумачыў дырэктар. — 70% нашых блокаў ідзе на экспарт у Расію. Суседскія спажыўцы, як дзяржаўныя, так і прыватныя, ужо адчулі смак ад будоўлі з такіх матэрыялаў. А нашы людзі чым горшыя? Калі яны ўсё жыццё збіралі на свой дом, дык чаму б нам не пасадзейнічаць ім у пабудове не толькі надзейнага і моцнага, але чыстага і карыснага для здаровага жыцця жылля.



ЗА ДВУХПАВЯРХОВЫ КАТЭДЖ — ЯК ЗА ДВУХПАКАЁЎКУ

Пра карысныя ўласцівасці прадукцыі завода сведчыць і тое, што некаторыя яго працаўнікі будуюць жыллё менавіта з парызаванай керамікі, створанай, што называецца, уласнымі рукамі. Сярод іх Уладзімір ЗАРОЎСКІ, вядучы інжынер па аўтаматызацыі сістэм кіравання, які проста праз паветра ўнутры дома адчувае, што такое свежасць, натуральнасць і камфортная тэмпература:

— Раней я жыў у кватэры ў маналітным доме. Апошнія два гады ва ўласным доме з керамічных блокаў я адчуваю сябе так, быццам на свежым паветры знаходжуся. Не думаю ні пра вільгаць, ні пра мароз. Калі я выводзіў сцены, то клаў раствор толькі па баках цагліны: знешнім і ўнутраным краях, а не на ўсю шырыню, каб не стваралася скразных «масткоў холаду». Дарэчы, іх адразу атрымалася ў 9 разоў менш, бо я будаваўся з блокаў 9 NF.

Уладзімір Ягоравіч узводзіў сцены сам (хоць валодае не спецыяльнымі будаўнічымі ведамі, а ўмелымі рукамі і разумнай галавою), разам са сваякамі. Ён пакуль не адстройваў дом звонку ніякімі дэкаратыўнымі матэрыяламі. Пры гэтым ён выглядае вельмі прывабна. Два паверхі з чырвона-аранжавых блокаў з непрыкметнымі воку адценнямі глядзяцца, як суцэльны і закончаны варыянт будынка, абкладзены вонкавай цэглай. Пры гэтым рабрыстая паверхня керамікі, здаецца, выконвае яшчэ і дадатковую дэкаратыўную функцыю.

Ва ўсім катэджы, пачынаючы з цокальнага памяшкання і заканчваюцца гарышчам, узімку пастаянна трымалася 20 градусаў, пры тым што пакоі ў доме не ізаляваныя. Гэта камфортная для гаспадароў тэмпература, якую з лёгкасцю можна было б павысіць. Зрэшты, за абагрэў 280 м² ён плаціў прыкладна 450 тысяч рублёў у месяц — у столькі ж абыходзілася і старая двухпакаёўка.

Аператар фармоўкі Аляксандр ЯКУБОЎСКІ сочыць за фармоўкай, нарэзкай і загрузкай цэглы на сушыльныя ваганеткі.

Набыць парызаваную керамічную цэглу можна не толькі на прадпрыемстве, а і ў афіцыйнага дылера завода на гандлёвай пляцоўцы «Аграмол»: г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 199. Падрабязней азнаёміцца з прадукцыяй прадпрыемства можна на сайце rkz.by або ў аддзеле збыту па тэлефоне 689-80-80 (адзіны нумар для ўсіх мабільных аператараў).

УНН 600077710

ЧЫСТАЯ ВАДА З КРАНА

У жыхароў Маладзечна яна такая штодзень

«Я без асцярогі п'ю ваду з любога крана ў Маладзечанскім раёне, бо дакладна ведаю, што яна чыстая», — прызнаецца дырэктар гарадскога камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Маладзечнаводаканал» Андрэй ПАЎКШТА. Па словах дырэктара, абсалютная большасць насельніцтва раёна забяспечана якаснай вадой, якую можна, не баючыся, піць адразу з крана. А тыя, хто прапаноўвае набыць дарагія фільтры для ачысткі вады, імкнуцца на даверлівасці людзей зарабіць грошы.

— «Маладзечнаводаканал» — гэта арганізацыя, якая абслугоўвае ў водазабеспячэнні ўвесь Маладзечанскі раён, у якім 90% насельніцтва мае якасную ваду, адпаведную ўсім нарматыўным патрабаванням, — расказвае дырэктар прадпрыемства. — У раёне толькі меней за 10% вады з утрыманнем жалеза, вышэйшым за норму. Водазабеспячэнне ў Маладзечне адбываецца з двух водазабораў: «Крыніца» і «Гелінова». Глыбіні свідравін — ад 35 да 300 метраў. На ўсіх водазаборах маюцца станцыі абезжалезвання. Штодзённае выкарыстанне пітной вады насельніцтвам Маладзечне складае ад 20 да 22 тысяч кубічных метраў у суткі; калі ўлічваць увесь раён, то гэта яшчэ 2 тысячы.

Акрамя таго, сёння пад наглядам «Маладзечнаводаканала» больш за 516 кіламетраў сетак водаправода і больш за 317 кіламетраў сетак каналізацый, 27 ачышчальных збудаванняў, 160 артэзіянскіх свідравін, 46 каналізацыйна-помпавых станцый. У прадпрыемства маюцца сертыфікаты экалагічнай адпаведнасці якасці вады і сістэмы кіравання аховай навакольнага асяроддзя.

На прадпрыемстве працуе 460 чалавек, з іх 120 — моладзь. Пра сваіх супрацоўнікаў тут дбаюць: паляпшаюць умовы працы, аказваюць сацыяльную падтрымку. Калектыў прымае ўдзел ва ўсіх галіновых спартакіядах і традыцыйна перамагае ў скачках у даўжыню і футболе. На прадпрыемстве няма цякучасці кадраў. За апошнія гады заяву на звальненне падалі адзінкі.

Па словах дырэктара «Маладзечнаводаканала», апошнім часам жыхарам раёна часта сталі прапаноўваць усталяваць дарагія фільтры для ачысткі вады. Прадаўцы пераконваюць пакупнікоў хімічнымі доследамі, якія насамрэч дэманструюць не забруджвальнасць вады, а наяўнасць у ёй мікраэлементаў, не толькі не шкодных, а нават карысных для здароўя.

Паводле слоў Андрэя Паўкшта, галоўная прычына, па якой можна назваць ваду няякаснай, — гэта высокі працэнт наяўнасці жалеза. Для таго, каб яго зрабіць ніжэйшым, усталёўваюцца станцыі абезжалезвання. У двух аграгарадках такія станцыі ўжо пабудаваныя. «Мы плануем працягваць гэтую працу, — кажа дырэктар. — У нас ужо падрыхтавана праектна-кашторысная дакументацыя на яшчэ 2 аграгарадкі і ўсталяванне 3 станцый у іх. Дзякуючы ўдзелу ў дзяржаўнай праграме «Чыстая вада», у апошнія гады такім чынам аграгарадкі Хохлава, Хожава, Селіўцы, Гранічы сталі на 100% забяспечаны чыстай вадой».

Па словах Сяргея ФРЭНКЕЛЯ, начальніка лабараторыі «Маладзечнаводаканала», перад тым, як трапіць да спажыўца, вада праходзіць доўгі шлях ад артэзіянскай свідравіны і да крана ў доме. «Не сакрэт, што ў Беларусі вада ў свідравінах, як правіла, мае завялікую колькасць жалеза. Гэта наша геаграфічная асаблівасць. Таму ў горадзе Маладзечна зманціраваны

Лабарант Лілія КАРНАЦКАЯ кожны дзень сочыць за чысцінёй вады.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

і працуюць дзве станцыі па ачыстцы вады. Выходная колькасць жалеза ў нашых свідравінах — каля 1 мг/л, а спажыўцу падаецца вада практычна без яго (па факце — у сярэднім 0,3 мг/л)», — кажа спецыяліст.

Напрыклад, тое, што падчас кіпячэння ў вадзе ўтвараецца асадак, сведчыць не пра яе нізкую якасць, а пра тое, што ў ёй досыць высокая агульная жорсткасць вады. Гэта не шкоднасць, а прыродная характарыстыка беларускай пітной вады. Бо яна, у адрозненне ад бутыляванай, якая праходзіць поўную хімічную ачыстку і штучную мінералізацыю, мае натуральны прыродны састаў.

— Сёння ёсць такія «ратавальнікі чалавецтва», якія сцвярджаюць, што з крана ідзе шкодная для здароўя вада: для зубоў, страўніка, нырак, — тлумачыць начальнік лабараторыі. — І без сістэм дадатковай ачысткі чалавека чакае хуткая і пакутлівая смерць. Не верце! Для Маладзечна такія дадзеныя — звычайная мана і выцягванне грошай з людзей. Задача такіх прадаўцоў — за высокі кошт прадаць ачышчальную сістэму, атрымаць прыбытак і забыцца на спажыўца. Прыйсці ў маладзечанскую кватэру для праверкі якасці вады могуць толькі дзве арганізацыі: «Маладзечнаводаканал» і Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Хімічныя доследы — электроліз, TDS-метры, якія праводзяць прадаўцы сістэм, — не правераны ні ў адным органе Дзяржстандарта. Гэта не больш, чым фокусы, і якасць вады ніяк на іх не адбіваецца.

Таксама ў «Маладзечнаводаканале», як і ва ўсіх водаканалах краіны, распрацавана рабочая праграма кантролю якасці вады. Ён адбываецца на ўсіх стадыях: ад здабычы вады са свідравін да апошняга крана. У залежнасці ад паказчыкаў, якіх для КУП існуе каля 20, некаторыя аналізы робяцца раз на год, асобныя — тры разы на тыдзень, але ўсе яны дакладна распісаны ў праграме, якая падпісваецца ў органах мясцовага самакіравання, узгадняецца з Цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі. На мікрабіялагічны аналіз вада бярэцца тры разы на тыдзень з рэзервуара, каб выключыць магчымасць мікробнага забруджвання паводкавымі водамі, асадкамі. Па хімічным саставе вада кантралюецца раз на год па кожным паказчыку. Па абагульненых паказчыках — жорсткасць, вадародны паказчык Ph, нафтапрадукты — кантроль адбываецца раз на квартал. Амаль усе даследаванні праводзяцца на базе лабараторыі водаканала.

«Вада ў Маладзечне не толькі бяспечная, але і прыемная на смак. Яна не патрабуе дадатковага кіпячэння, абеззаражвання, — упэўніў Сяргей Фрэнкель. — Звычайна нашы жыхары без боязі п'юць ваду адразу з-пад крана».

Будынак водаканала прыцягвае ўсіх яркімі фарбамі і прыгожым панадворкам.

УНП 600000011

ПРАСТОРА ДЛЯ ТВОРЧАГА РОСТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Мы не рыхтуем да школы, але займаемся творчасцю разам з падапечнымі. Так дзеці лепей сацыялізуюцца: спакойныя — разнявольваюцца, вучацца праяўляць сябе, занадта актыўныя — становяцца кіруемымі і больш паслухмянымі», — дзеліцца вопытам кіраўнік цэнтра.

У «Растку» для дашкольнікаў працуюць студыі рытмікі і харэаграфіі, музыкі і песні, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, развіваючых гульняў, англійскай мовы, а таксама тэатральная студыя. Але традыцыйным «студыйным» падыходам да працы «расткоўцы» не абмяжоўваюцца. У цэнтры часта ладзяцца святы для ўсёй сям'і і майстар-класы, на якіх бацькі могуць прыйсці разам з дзеткамі. «Часцей за ўсё прыходзяць на такія заняткі маці ў дэкрэтным адпачынку, ці тыя, у каго дзеці — дашкольнікі. Яны садзяцца побач за стол, маці робіць свой выраб, дзіця — свой. Мы дапамагаем ім абодвум, і маці, вядома ж, глядзіць, што робіць дзіця. У нас ёсць такога кшталту і разавыя майстар-класы, і пастаянныя групы», — расказвае Вольга ЯФІМЧАНКА, кіраўнік студыі дызайну «Утульнасць» дзіцячага цэнтра культуры.

Акрамя таго, што Наталля Соніч кіруе дзіцячым цэнтрам, яна таксама вядзе студыю эстрадных спеваў «Брава». Яе ўдзельнікі, якіх цяпер 14, паспяваюць не толькі вучыцца ў школе, але і наведваць студыю, а ў выхадныя — выступаць на творчых і вакальных конкурсах, у якіх амаль заўжды займаюць прызавыя месцы. За першыя пяць месяцаў 2016 года на рахунку калектыву — 72 перамогі, з якіх больш за 30 атрымана ў маі. Асабліва «Брава» ганарыцца Маркам Войткам, які амаль усё дзяцінства праспяваў у студыі, пасля паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, а цяпер — саліст групы «PROвокация». «Прыемна, што Марк не забываецца на родны калектыў. Часам нават спецыяльна прыязджае на нашы выступленні, каб падтрымаць хлопцаў і дзяўчат, бо ведае, як для іх гэта важна», — з лагоднай усмешкай падсумоўвае Наталля Соніч.

МАЛАДЗЕЧАНСКІЯ ЛЫЖАЧНІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

— З цягам часу і дзякуючы пастаянным трэніроўкам гэта выпраўляецца і станоўча адбіваецца на далейшым развіцці вучняў. Многія з нашых выхаванцаў маюць поспехі не толькі ў мастацтвах, але і перамагаюць на гарадскіх, раённых, рэспубліканскіх алімпіядах па матэматыцы (часцей за ўсё гэта музыкі), прыродазнаўчых і філалагічных навуках.

Аляксандр РОЗІН, кіраўнік ансамбля «Маладзечанскія лыжачнікі», прыгадвае, што калі набіраў першых удзельнікаў, да яго трапілі выключна хлопцы. «Так і пайшло, што калектыў у нас — мужчынскі. Толькі нядаўна да нас далучылася дзяўчына, якая прыўносіць парадак, але з іншага боку — атрымлівае ад нашых хлапцоў паслухмяныя паводзіны і паважлівае стаўленне», — дзеліцца кіраўнік.

Пачыналі з нуля. Шукалі майстроў, якія б маглі вырабіць лыжкі для ігры нядорага і якасна. Раней выкарыстоўвалі распісаныя пад хахламу, а цяпер — непафарбаваныя. Бо лыжка жыве сезон-два, а пасля, як правіла, ламаецца. Па словах Аляксандра Рагозіна, і нот для лыжачнікаў ніхто не піша, і прыёмы не распрацоўвае. Таму даводзіцца праяўляць у пастаноўцы нумароў усю крэатыўнасць, на якую здольныя, і кіраўніку, і самім школьнікам. Цяпер ансамбль традыцыйна выступае пад фанаграму і, як склалася, у народных кашулях.

З цягам часу ў лыжачнікаў паляпшаецца не толькі пачуццё рытму, але і развіваецца артыстызм, знікае боязь сцэны, заўважае іх настаўнік. «Самае галоўнае — мы можам выступаць дзе заўгодна! Узялі касцюмы, лыжкі, заплечнікі — і паехалі. Мы мабільныя!», — кажа кіраўнік ансамбля. – Прыемна, што дзеці стараюцца прыйсці на заняткі, амаль ніхто не прапускае ўрокаў. Значыць, ім цікава, і мы нездарма калісьці вырашылі сабраць калектыў.

■ Справа медыцынская

Чым маладзейшы, тым даражэйшы

Кацярына Зяневіч — малады спецыяліст, доктар агульнай практыкі. У свае 26 яна ўжо працуе загадчыцай Аляхновіцкай амбулаторыі Маладзечанскай цэнтральнай раённай бальніцы. Кацярына два гады таму скончыла Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт па спецыяльнасці «Доктар-лячэбнік». Год інтэрнатуры правяла ў Маладзечанскай бальніцы, прайшла перападрыхтоўчыя курсы, стала доктарам агульнай практыкі, і амаль адразу ж атрымала адказную пасаду, на якой працуе ўжо паўгода.

— Я ішла ў прафесію мэтанакіравана. Сярод сваякоў шмат дактароў. Усё маё дзяцінства прайшло не ў садзіку, а ў маці на ФАПе і ў амбулаторыі. У тэрапію пайшла таму, што падабаецца больш працаваць з дарослымі. Праўда, цяпер даводзіцца лячыць і дзяцей. Гэта цяжкавата, але мне заўжды дапамагаюць парадамі дактары з Маладзечанскай бальніцы і сям'я, — расказвае Кацярына.

Па словах маладога доктара, большасць яе аднагрупнікаў засталася працаваць у Мінску. Чаму сама размеркавалася ў раён? «Пэўную ролю адыграў прыклад маці. Ды і пражыла я тут усё жыццё. Таму працаваць у амбулаторыі больш даспадобы, чым у горадзе», — адказвае яна.

Цяпер у працоўны дзень на прыём да Кацярыны прыходзіць ад 30 да 60 чалавек (усяго насельніцтва ў зоне абслугоўвання 2750 чалавек).

«З калектывам я ў добрых адносінах. Калегі мне вельмі дапамагаюць. Напрыклад, медсёстры могуць і ціск памерыць, і градуснік даць, калі я на выездзе, каб чалавек не сядзеў у чарзе без увагі, і кардыяграму здымуць. І ў іх можна быць упэўненым», — кажа Кацярына Зяневіч. У амбулаторыі ёсць і лабараторыя, дзе робіцца асноўная частка аналізаў. Працуе дзённы стацыянар, фізія- і акушэрскі кабінет. «Для поўнай аснасткі не хапае толькі рэнтгена», — смяецца загадчыца.

Сёння доктар агульнай практыкі — своеасаблівы аналаг заходняга «сямейнага» ўрача, бо шчыльна кантактуе з аднымі і тымі ж людзьмі. Ён валодае агульнымі, больш шырокімі за тэрапеўта ведамі (можа лячыць і дзяцей), прызначае неабходныя абследаванні, правадзіць першаснае лячэнне перад тым, як накіраваць да вузкага спецыяліста.

Праўда, прызнаецца Кацярына, гэта адна з прычын, чаму пакідаць працу за парогам дома не атрымліваецца: «Асабліва хвалююся за дзетак да года, бо ў іх хваробы развіваюцца хутчэй, чым у дарослых. Перажываю часам так, што званю вечарам і пытаюся, ці спала тэмпература ў дзіцяці. І даю нумар мамам, у якіх маленькія, і пры неабходнасці кансультую па тэлефоне ўвечары».

Нягледзячы на ўсе непазбежныя для яе прафесіі цяжкасці, Кацярына захоўвае бадзёры дух і з захапленнем расказвае пра сваю справу: «Калі да мяне прыходзіць дзядуля, які скардзіцца на жыццё, а праз тыдзень на прыёме кажа: «Доктар, дзякуй, вы мне так дапамаглі!», — гэта прыдае столькі сіл! Радасць ад таго, што дапамог камусьці, натхняе развівацца, удасканальваць веды і працаваць надалей».

Матэрыялы падрыхтавалі Вераніка ПУСТАВІТ, Ірына СІДАРОК, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Надзеі БУЖАН і Сяргея НІКАНОВІЧА.

«КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ УСЁ!»

Гэта папулярны і досыць жывучы лозунг. Ва ўсіх рэспубліках былога Савецкага Саюза ім пачалі кіравацца яшчэ з даваенных часоў і, як выглядае, не кідаюць па сёння. Ва ўсякім разе, куды ні ткніся, паўсюль аб'явы кшталту: «Фірме патрабуецца галоўны бухгалтар...», прадпрыемству — эканаміст, краме — прадаўцы. І тут жа, побач усе патрабаванні да «кандыдатаў»: каб была адпаведная адукацыя, каб стаж работы не меней за тры гады, каб нават узрост...

Наймальнікаў, працадаўцаў зразумець няцяжка: сёння яны могуць выбіраць, прычым самых дасведчаных. Але ж «кандыдатам», каб гэткімі стаць, трэба недзе паспрабаваць, павучыцца, магчыма, нават нарабіць памылак. А дзе? Ды, вядома ж, у нейкіх іншых арганізацыях. Дык няхай яны, маўляў, і рыхтуюць спецыялістаў, а мы пераманім гатовых...

У сувязі з гэтым хачу расказаць, як гадаваў сабе кадры старшыня калгаса з майго дзяцінства.

...Даўно гэта было. Ужо і не верыцца, што ў вёсках тады (у сярэдзіне мінулага стагоддзя) віравала жыццё, што яны былі вялікія і шматлюдныя, што ў сем'ях нараджалася па трое-чацвёра малых...

Адпаведна шмат было і пачатковых школ.

Потым, пасля іх заканчэння, дзеці хадзілі ўжо ў сярэднія школы, якія, як правіла, знаходзіліся на цэнтральных сядзібах калгасаў.

Дык вось. Нас — і малых, і трохі большых, з розных навакольных вёсак і вёсачак — грамада набіралася будзь здароў: ідзём са школы — уся вуліца ўшыркі занятая (машыны ж тады не гойсалі).

Але, здаралася, адна даганяла: старшыня, на службовым «козліку». Пад'едзе і амаль заўсёды спыніцца. Адчыніць дзверцы і пытае ў нас:

— Ну, хваліцеся, хто што атрымаў?

— Я — пяцёрку!

— Я — дзве!

— Я — чатыры і пяць, — наперабой выхваляюцца выдатнікі.

— А вы чаго заціхлі? — пытае тады старшыня ў хлопцаў, якім хваліцца няма чым.

За іх адказвалі «сябры»:

— А ў Петрыка двойка па літаратуры...

— А Грышка па матэматыцы задачу не рашыў...

— Праўда? — удакладняў кіраўнік гаспадаркі.

Тыя ўбок адводзілі вочы і яшчэ ніжэй апускалі галовы.

— Ну тады... сядайце ў машыну, — загадваў ім старшыня. — Падвязу вас дадому.

Тыя не маглі спярша скрануцца з месца, не верылі сваім вушам...

— Смялей! — камандаваў ім старшыня і сапраўды падвозіў. Сам! На «козліку»! На высокай хуткасці... Са свістам, можна сказаць. І да самых весніц!

Калі б такое здарылася толькі аднойчы, і дзеці, і дарослыя тры дні пагаварылі б, а на чацвёрты забыліся. Але ж не: цягам навучальнага года гэта паўтаралася не раз.

Урэшце выдатнікі ды іх бацькі сталі крыўдаваць, высвятляць прычыну: маўляў, чаму гэта старшыня падвозіць троечнікаў, двоечнікаў, а то і «калышнікаў» (лепшых, трэба сказаць, ён таксама падвозіў, але радзей)?

І той, «заціснуты ў кут», патлумачыў, што выдатнікі пасля школы хутчэй за ўсё паступяць недзе вучыцца, атрымаюць дыпломы і застануцца ў гарадах. Іншая рэч — тыя ж троечнікі. Ім можна даць накіраванне ў прафтэхвучылішчы. Яны пасля вучобы вернуцца на працу ў калгас.

— Гэта будуць МАЕ кадры, — казаў старшыня. — Мне з імі жыць і працаваць.

Так урэшце яно і адбывалася. У гаспадарцы некалькі дзесяцігоддзяў не было праблем з тымі ж даяркамі, трактарыстамі, аграномамі... Яны асядалі на сваёй жа, роднай зямлі, хто здалёк, хто зблізку прывозілі сабе сужэнцаў, стваралі сем'і. Іх дзеці да тых самых настаўнікаў хадзілі ў пачатковыя школы, потым у сярэднія, вёскі жылі...

Вось такая была кадравая палітыка ў нашага старшыні калгаса: мудрая, перспектыўная, выніковая. І шкада, што пра гэты досвед не пісалі тады ва ўсіх газетах, не распаўсюджвалі па іншых гаспадарках. Глядзіш, зусім па-іншаму выглядалі б вёскі: не было б сярод іх так званых выміраючых.

Валерый Гаўрыш,
г. Чавусы.

ЭХ, КАБ НЕ ДРАБІНЫ...

Каханне было маладым і вельмі гарачым. Прычым настолькі, што прыйшлося стварыць сям'ю. Мужу на той час ледзь стукнула васямнаццаць, жонцы — усяго шаснаццаць. Але ж зажылі: з часам нарадзілі дзяцей, пагадавалі іх і нават не развяліся, хоць збіраліся разоў сто, а можа, і больш!

Рэч у тым, што ўсе гадочкі Мар'я люта, можна сказаць, раўнавала свайго Івана. Прычым не без падстаў, бо імпэт гэтага вясковага лавеласа стаў крыху спадаць хіба што пад старасць, а так... Чаго толькі не было!

Іванавы ўспаміны, як выглядае, у большасці прыемныя, Мар'іны — што той чэмер...

— Бабнік ён яшчэ той! З маладосці ніводнай спадніцы не прапускаў! — прызналася неяк яна ўжо дарослым сямейнікам.

— Ды кінь ты, — паспрабаваў перапыніць Мар'ю муж.

— А чаму гэта? Я што — можа, няпраўду кажу? — гнула сваё жонка. — І сам ты вочы разуй: у вёсцы ж палова дзяцей на цябе падобныя!

— Ну бабы... Вам абы языкамі мянціць, — бурчэў стары. — Нясеш тут розную лухту.

— То, можа, няпраўда, што ты з Нінкай-блудніцай...

— Не, няпраўда.

— І з Любкай, скажаш, няпраўда?

— Не...

— А з Гэлькай? З Гэлькай ты таксама на вышкі не лазіў? — гарачылася жонка. — Дзеткі, ці паверыце: у яе, у гэтай прастадайкі, вяселле ў хаце было — дачку аддавала... Захацела як быццам каўбасы́ на сталы падрэзаць. Спадніцай крутнула, кош у рукі ўзяла — і па драбінах на гарышча... Толькі лыткі яе схаваліся, гэты распуснік, бачу, следам палез... Ага, памагчы!.. Пагляджу ж, я думаю, як ён памагае. Хвілін колькі счакала і таксама на вышкі. Вочы б не бачылі такога паскудства! Раздзеў ён Гэльку, абвіўся, як вуж... Што — скажаш, зноў няпраўда?!

— Ды не... Зараз не скажу. Вось гэта ўжо было, — не стаў адпірацца Іван. — А ўсё чаму? Дурны быў, гарачы...

— Няўжо дайшло?! — не паверыла вушам жонка. — Няўжо зразумеў і цяпер шкадуеш?

— Ды яшчэ як!.. Дарваўся ж, не раўнуючы, як дурань да мыла: не сцяміў, што *ўслед за сабой трэба было драбіны ўсцягнуць*...

Поп сваё, карацей, а чорт — сваё.

Фаіна Касаткіна,
г. Паставы.

ПРАГА ДА МУЗЫКІ

Усё далей і далей адыходзяць падзеі майго маленства, але памяць надзейна трымае іх, і ўсплываюць яны так ясна...

Дзякаваць Богу, нам з мамай не давялося жыць пад немцамі, зносіць іх здзекі. Праўда, што такое бомбы, я помню, і што такое станцыі, бітком забітыя людзьмі — таксама. Нялёгкай была наша дарога на ўсход, у эвакуацыю, нялёгкім было і жыццё. Але ж цяпер не пра гэта, цяпер пра тое, што людзі заўжды заставаліся людзьмі.

...Нас, эвакуяваных, прынялі ў адным з калгасаў Саратаўскай вобласці. Мне тады ішоў адзінаццаты год: ростам — кату па пяту, як той казаў, сілы — як у вераб'я, а вось спруту... З-пад зямлі вырастала... Там, дзе трэба і не трэба.

Больш за ўсё мяне вабіў Валодзя, наш вясковы музы́ка. І не столькі сам, колькі яго гармонік, яго балалайка. Слухаць магла дзень і ноч. А ўжо калі Валодзя дазваляў мне дакрануцца да кнопачак ці правесці пальцамі па струнах, шчасце не мела межаў!

Помню, дачакаўшыся вясны, вясковая моладзь (а мы ж за ёю) пайшла на луг. Там было вельмі прыгожа і раздольна, там было весела і нават... сытна, бо мы збіралі розную траву і набівалі ёй свае галодныя жываты.

Але ж для таго, каб апынуцца на лузе, трэба было перайсці рэчку. Для гэтага ў адным месцы ляжала кладка — вузкая, слізкая, так што не кожнаму ўдавалася прайсці па ёй. Хто-нікто падаў у ваду, падымаючы фантаны пырскаў і рогату.

Дык вось, неяк наш Валодзя (а ён заўсёды ішоў наперадзе) пабаяўся ісці па кладцы з гармонікам. А таму, здымаючы яго з пляча, спытаў:

— Э-э, хто перанясе?

— Я! — тут жа крыкнула я, молячы вачыма: «Дай!.. Перанясу!»

Чаму Валодзя згадзіўся, не разумею дагэтуль. Бачыў жа, якая кладка, якая я, ведаў, колькі важыць гармонік.

Але ж ён адумацца, мусіць, не паспеў, як інструмент (ура!) апынуўся ў мяне ў руках. Як я, ад шчасця не адчуваючы цяжару, прабегла палову «шляху». А далей...

Як і трэба было чакаць — зляцела з кладкі... Разам з гармонікам.

Усе на нейкі міг аслупянелі, а потым над ракой пачуўся гэткі рогат, што ўзняліся вароны...

Не смяяўся толькі Валодзя: ён скочыў у неглыбокую ваду і, агрэўшы далонню па патыліцы, выцягнуў з рэчкі спачатку мяне, а потым гармонік...

Гулянка была не гулянка: мне было холадна, сорамна, крыўдна, я баялася падысці да музы́кі: ён жа трохі вучыў мяне іграць — праўда, на балалайцы...

Я, дарэчы, потым сама зрабіла яе: да дошчачкі прымацавала струны з пераплеценага конскага воласу. І Валодзя не пасмяяўся: ён сказаў, што нейкія меладычныя гукі мой «інструмент» выдае!

А галоўнае, што аднойчы тую маю «балалайку» ўбачылі салдаты з суседняга вайсковага аэрадрома. І потым у падарунак мне прынеслі... сапраўдную домбру!

Усе яе звалі «гарбузом», але гэта не перашкаджала мне іграць — адводзіць душу.

...І сёння, праз доўгія-доўгія гады я схіляю галаву перад тымі салдатамі. Чужая ж была дзяўчынка, а бач — зразумелі прагу да музыкі. І, як маглі, падтрымалі.

Раіса Васільева,
г. Гомель.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

■ Традыцыі

ПУСЦІЦЕ ДЗЯЦЕЙ У ХРАМ

Гэта ўжо за правіла: летнікі ў дзіцячым садку-яслях №6 пачынаюцца з экскурсіі ў храм. Бласлаўленне на іх ад настаяцеля айца Грыгорыя атрымала дырэктар гісторыка-краязнаўчага музея Раіса Горбач. Яна і паведаміла, што экскурсіі праводзіць з 2007 года, а з 2010-га пачала дзейнічаць цэлая праграма супрацоўніцтва музея з царквой.

— Хрыстос уваскрос! — так павітала экскурсаводка выхаванцаў дзіцячага садка «Алеся».

— Сапраўды ўваскрос! — адказваюць дзеці.

І Раіса Іванаўна тлумачыць, што так вітаюцца праваслаўныя цэлых 40 дзён — ад Вялікадня да Узнясення.

Потым яна вучыла дзяцей правільна хрысціцца: «На лоб, каб асвяціць нашы думкі; на жывот, каб асвяціць жыццё; на правае і левае плячо, каб асвяціць нашы ручкі на добрыя справы».

Дзеці са шчырай непасрэднасцю паўтаралі рухі.

На тэрыторыі святыні Раіса Іванаўна, улічваючы ўзрост экскурсантаў, коратка расказала, што кожны храм мае сваю назву (наш — у гонар іконы Божай Маці «Дзяржаўная»), сваю архітэктуру. Дзеці даведаліся, як сябе паводзіць у царкве, як правільна прыкласціся да іконы на прастоле, паставіць свечку аб здароўі родных і за супакой душы памерлых, дзе праходзіць споведзь.

Пачулі малыя і аб некаторых абразах: у прыватнасці, аб іконе «Сямістрэльная» перад якой моляцца за змякчэнне сэрцаў сваіх крыўдзіцеляў і ўласнага сэрца — каб Бог дапамог дараваць свае крыўды; аб іконе «Усіх тужлівых Радасць», перад якой людзі просяць Божай дапамогі ў складаны час і перад якой трэба вучыцца быць удзячным — не забываць дзякаваць Богу за дапамогу, славіць Яго імя.

Напрыканцы экскурсіі Раіса Іванаўна завяла дзяцей у таямнічы пакой, дзе адбываецца хрышчэнне, паказала купель, у святую ваду якой тройчы (у імя Айца і Сына і Святога Духа) бацюшка акунае маленькіх падчас хрышчэння.

...Якая карысць ад такіх экскурсій? Адказ на гэта пытанне мне падказала дзіцячая цікаўнасць і шчырасць, «Пусціце дзяцей прыходзіць да Мяне і не перашкаджайце ім, бо такіх ёсць Царства Божае. Праўду кажу вам: хто не прыме Царства Божага, як дзіця, той не ўвойдзе ў яго. І, абняўшы іх, усклаў рукі на іх і блаславіў іх» (Евангелле ад Лукі, 10, 14-16).

Валянціна БОБРЫК.

■

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 23 (323)

УЗДОЎЖ ПА ШАГАЛАЎСКАЙ

Падчас шпацыру па вуліцы Марка Шагала карэспандэнту «Звязды» пашчасціла трапіць у дом №5, які не мае аналагаў у свеце

Частку віцебскай вуліцы газеты «Праўда» перайменавалі ў гонар славутага мастака яшчэ ў сакавіку. А вось беларускамоўныя шыльдачкі на дамах з'явіліся на днях, што цікава — асобныя з іх афармлены ў супрэматычным стылі. Кажуць, што і сама Шагалаўская неўзабаве будзе нагадваць сапраўдную мастацкую галерэю. А пачалося ўсё з таго, што некалькі гадоў таму на адным з дамоў з'явілася карціна Казіміра Малевіча «Смерць шпалерам». Цяпер жа вырашылі размаляваць сцены яшчэ пяці будынкаў. На адным ужо з'явіўся новы эскіз работы заснавальніка супрэматызму. Дарэчы, для размалёўкі фасадаў запрашаюць валанцёраў, а таму ў якасці вулічнага мастака сябе можа паспрабаваць нават аматар-пачатковец. Сам жа Малевіч, а дакладней яго партрэт, «прапісаўся» непадалёку — на сцяне гаражнага комплексу, што за домам №5.

Нават шыльды на Шагалаўскай вуліцы выкананы ў супрэматычным стылі.

Мара пра калекцыі з лепшых музеяў

Пакуль што па вуліцы Марка Шагала ні прайсці, ні праехаць. Паўсюль будаўнічая тэхніка, пыльна. Тут поўным ходам ідзе рамонт: абнаўляюць дахі, фасады дамоў. Найбольшая колькасць будаўнікоў шчыруе каля дома №5. У ім пасля таго, як завершыцца рэканструкцыя, будзе музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Таго самага, якое заснаваў Марк Шагал, і дзе жылі і працавалі Казімір Малевіч, Юдаль Пэн, Эль Лісіцкі, Мікалай Суэцін і іншыя сябры авангарднага мастацкага аб'яднання УНОВІС.

На першым паверсе, паводле слоў майго гіда, будзе некалькі музейных залаў, дзе наведвальнікі даведаюцца пра Віцебскую мастацкую школу пачатку XX стагоддзя. Тут жа размесціцца і вялізная выставачная зала. Яна будзе абсталявана па апошнім слове тэхнікі, каб можна было выстаўляць творы любога ўзроўню.

— Я мару, што сюды прывязуць калекцыі з лепшых музеяў свету — з Луўра, Траццякоўкі, — кажа Андрэй Духоўнікаў. — Для нас самае важнае паказаць беларусам Лісіцкага, Малевіча, а дасць Бог, і Шагала. Я быў нядаўна ў Траццякоўцы. У іх ёсць вялікі праект па рускім авангардзе пачатку XX стагоддзя ў правінцыяльных музеях. А ў Віцебску якраз неўзабаве будзе адзначацца 100-годдзе мастацкага вучылішча, затым споўніцца сто гадоў УНОВІСу. Цудоўная нагода! Я хацеў бы, каб да гэтага часу мая мара спраўдзілася. Супрацоўнікі Траццякоўкі, што радуе, гатовыя супрацоўнічаць з будучым музеем Віцебскага мастацкага вучылішча — адзіным у свеце музеем, які цалкам будзе працаваць па тэме рускага авангарду. Яму не будзе аналагаў. Разам з тым, як ні парадаксальна, гэта адзіны музей, у якім няма ніводнай уласнай карціны рускага авангарду. Усё ў савецкія часы было вывезена, скрадзена, выкуплена, выкінута... Работніца краязнаўчага музея расказвала, як, калі яна прыйшла працаваць у пачатку 70-х, яны чысцілі фонды і выкінулі шмат «напалову дзіцячых малюнкаў, квадрацікаў усялякіх». Магчыма, гэта былі знішчаны рэшткі архіваў...

Роспіс будынка па эскізе Малевіча «Смерць шпалерам!» паспеў стаць брэндам Віцебска.

Мне адной з першых пашчасціла зазірнуць унутр будучага музея задоўга да яго афіцыйнага адкрыцця. Міні-экскурсію па будынку, знакаваму не толькі для нашай краіны, але і для ўсяго мастацкага свету, правёў **дырэктар Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва Андрэй ДУХОЎНІКАЎ**.

— Гэты будынак яшчэ да нядаўняга часу быў у зямлі да самых вокнаў. Пакуль мне на вочы не трапіўся стары малюнак. На ім было Віцебскае народнае мастацкае вучылішча з мураванай кладкай. Сталі рабіць спробы раскапаць і, о цуд, аказалася, што падмурак сапраўды ёсць. Ды які прыгожы! Цяпер ён рэстаўрыруецца, — спыняецца на ўваходзе Андрэй Духоўнікаў і запрашае ўнутр будынка.

«Восем чырвоных прамавугольнікаў»... на столі

Падымаемся на другі паверх па лесвіцы з металічнымі парэнчамі. Андрэй Духоўнікаў кажа, што яна аўтэнтычная, захавалася з тых самых, шагалаўскіх, часоў. На сцяне заўважаю надпіс, зроблены вугалем: «Азгур».

— Хутчэй за ўсё, ён належыць скульптару Заіру Азгуру, які тут вучыўся, — перахоплівае мой погляд Андрэй Духоўнікаў. — Я дасылаў фотаздымак у музей Азгура. Яны пацвердзілі характэрнае для скульптара «р». Заіру было гадоў 15-16, калі ён пакінуў гэты аўтограф.

А вось тут, на ўваходзе, неўзабаве з'явіцца вялікая шкляная сцяна, на ёй будзе мультымедыйная інсталяцыя. Хочацца, каб у наведвальнікаў з'явілася адчуванне, што яны перанесліся на машыне часу ў гісторыю гэтага будынка і Віцебска — таго, якім ён быў стагоддзе таму.

Інтэр'ер спрабуем рэканструяваць па старых фотаздымках, архіўных дакументах, успамінах. Адзін з вучняў УНОВІСа казаў: «Калі ты падымаешся па лесвіцы, з левага боку — кабінет дырэктара, прама — трое дзвярэй, якія вядуць у пакойчыкі Малевіча, Ермалаева і Лісіцкага». Калі быць дакладным, то тут, за аднымі з трох дзвярэй, насамрэч была ванна Малевіча. А яго майстэрня знаходзілася побач, якраз праз сцяну ад кабінета Марка Шагала. У дырэктара вучылішча было два сумежныя пакойчыкі. Але калі прыехаў Казімір Малевіч, Марк Шагал аддаў калегу адзін з іх. Вось у ім і будзе музейная зала Казіміра Малевіча. Яна будзе асацыятыўнай, бо ніякіх арыгінальных прадметаў, на жаль, не захавалася. Тут паставім толькі стол і крэсла. Фішкай

Казімір Малевіч «прапісаўся» на сцяне гаражнага комплексу за былым мастацкім вучылішчам.

жа будзе вось гэтая арыгінальная свяцільня (паказвае на столь). Дызайнеры ўвасобілі тут карціну Казіміра Малевіча «8 чырвоных прамавугольнікаў». Гэта адна з вядомых яго работ. Прыходзьце сюды, калі музей адчыніцца, яна вельмі эфектна будзе глядзецца.

Галоўны экспанат — сам дом

— Мы не будзем нікога падманваць, не будзем казаць, што «вось гэта крэсла, на якім сядзеў сам Малевіч», — працягвае Андрэй Духоўнікаў. — Адкрыта кажам, што галоўны экспанат гэтага музея — сам дом. Цуд, што ён наогул захаваўся. Падчас вайны гэта вуліца была цалкам разбурана. Усе дамы былі знішчаны. У гэтага ж будынка нейкім дзівам нават ляпніна захавалася. А таксама некаторыя элементы, у прыватнасці балкончык. Пад паркетам савецкай эпохі будаўнікі знайшлі яшчэ адзін слой паркету. Магчыма, па ім хадзілі яшчэ Шагал і Малевіч. Унізе, бачыце, уся падлога засыпана пілавіннем і пакрыта ДВП, пад імі ляжыць аўтэнтычная мазаіка з паліраванага граніту. Фантастычна прыгожая. Дзякуючы ўсім гэтым нешматлікім знаходкам, будзе нават такі раздзел у музеі — гісторыя дома.

Андрэй ДУХОЎНІКАЎ праводзіць экскурсію па будучым музеі.

— Я чула, што музей адчыніць дзверы для наведвальнікаў да «Славянскага базару». Але ж, як я бачу, тут яшчэ даволі шмат працы...

— 24 чэрвеня, на Дзень горада, будзе афіцыйнае адкрыццё новай вуліцы. Урачыста адкрыюць памятную дошку ў гонар Марка Шагала. Рыхтуецца вялізны перформанс. У прыватнасці, Віцебскі маладзёжны тэатр «Кола» пакажа спектакль у аконных рамах будучага музея мастацкага вучылішча. Публіка будзе назіраць з вуліцы за тым, як па чарзе будуць загарацца загадзя дэкарыраваныя вокны: у іх разыгрываюцца кароткія сцэны. Вядома, будзе шмат гасцей. Прыедуць мэры гарадоў-пабрацімаў. Мы зладзім для іх экскурсію па гэтым будынку ў тым стане, у якім ён будзе. У нашага мэра такая пазіцыя — ніякай паказухі. Бо спешка тут недапушчальная, яна да дабра не давядзе. Цалкам завяршыць рэканструкцыю дома №5 мы зможам не раней чым праз паўгода, гэта пры ідэальных абставінах, бо толькі на мантаж і тэставанне абсталявання патрэбна 2 месяцы.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК .
Фота аўтара.

■ Гэта цікава

ШТО ПАДАРЫЦЬ... БІБЛІЯТЭЦЫ?

Незвычайная выстаўка адкрылася ў галоўнай кніжнай скарбонцы

Тут, у Музеі кнігі, да 10-годдзя новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі прадстаўлены падарункі, якія ўстанова атрымала ад сяброў і партнёраў.

— Многія з гэтых падарункаў вельмі экзатычныя, незвычайныя для Беларусі, — расказвае **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША**. — У нас шмат сяброў з далёкіх краін, для Беларусі іх мясцовыя творы мастацтва, кнігі — сапраўднае дзіва.

Самы галоўны і самы важны артэфакт на экспазіцыі — сімвалічны ключ, які дзесяцігоддзе таму падчас цырымоніі адкрыцця новага будынка падарыў бібліятэцы Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Тут можна пабачыць і незвычайныя кнігі, якія выходзілі ў розных краінах, творы нацыянальнага мастацтва з Афрыкі і Азіі.

— Праз гэту выстаўку мы бачым фактычна ўвесь свет, — дадае Алесь Суша. — Нехта нам, каб уразіць, дарыў вялікія выданні, памерам амаль метр, нехта, наадварот, прэзентаваў мікракнігі, памерам некалькі міліметраў. Таксама экспазіцыя падае гісторыю міжнародных культурных стасункаў нашай бібліятэкі з рознымі краінамі свету. Гэта і сведчанне пэўнага прызнання нашай установы, яе ролі ў сусветнай культуры, развіцці інфармацыйнай камунікацыі.

Супрацоўнікі бібліятэкі кажуць, што ім самім надзвычай цікава было фарміраваць выстаўку, а ў Музеі кнігі для такіх каштоўных падарункаў нават стварылі асобны фонд. Гэтыя рэчы вартыя ўвагі і вымагаюць беражлівага захавання.

Марына ВЕСЯЛУХА. *vesialuha@zvazda.by*

■ На суісканне Дзяржаўнай прэміі Беларусі

ВЕСЦІ ГУТАРКУ З МАЛЕНЬКІМ ЧЫТАЧОМ...

...выдатна ўмее пісьменнік Міхась Пазнякоў

Літаратура для дзяцей — жанр асаблівы. Каб кніга палюбілася маленькаму чытачу, яна павінна быць вясёлай, цікавай, забаўляльнай. А каб выданне адобрылі бацькі, яно мусіць не проста весяліць ды забаўляць, але і выхоўваць, пашыраць кругагляд, даваць новыя веды. Таму аўтару падчас бывае досыць складана знайсці тое самае залатое сячэнне паміж дыдактычным занудствам і пустымі бессэнсоўнымі жартачкамі.

Але думаецца, паэт, празаік, перакладчык, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў дакладна ведае рэцэпт паспяховай і запатрабаванай дзіцячай кнігі. Яго творы не залежваюцца на паліцах кнігарняў, не затрымліваюцца ў бібліятэчных сховішчах — іх чытаюць дзеткі разам з бацькамі, імі карыстаюцца выхавальнікі ў дзіцячых садках і настаўнікі пачатковых класаў. Нас ужо не здзіўляе заканамернасць: што ні новая кніга для дзяцей ад гэтага аўтара — чарговы поспех і чарговае прызнанне.

Таму намінаванне Міхася Паўлавіча на Дзяржаўную прэмію Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры — крок досыць узважаны і цалкам лагічны. І можна лічыць, што гэта не толькі і не столькі прызнанне высокай вартасці трох адзначаных кніг (пра іх крыху ніжэй), але і ў цэлым выказванне павагі да аўтара, які шмат гадоў працуе ў галіне дзіцячай літаратуры, умее праз кніжныя старонкі весці гутарку з маленькімі беларусамі, вучыць іх любіць родную зямлю, мову, маці, прыроду. Сённяшнія чытачы кніг Міхася Пазнякова — тыя, хто праз дзесяцігоддзі будуць працаваць настаўнікамі, журналістамі, урачамі. Яны стануць тварам краіны, у якой мы жывём сёння. І надзвычай важна, каб новыя пакаленні беларусаў мелі на паліцах якасныя, добрыя кнігі, з самага маленства вучыліся дабрыні, павазе да старэйшых, спагадзе і клопату пра жывёл.

Міхась Пазнякоў паказаў: словы можна не толькі запамінаць, вучыцца чытаць і пісаць, а з імі можна яшчэ і гуляць!

Кнігі Міхася Пазнякова, адзначаныя ў намінацыі на прэмію, можна разглядаць як паасобку, так і як адзін вялікі выдавецкі праект. Яны, як звёны ў ланцужку, з'яўляючыся самастойнымі, цесна знітаваныя паміж сабой. Так, кніга вершаў, лічылак, калыханак, смяшынак «У родным краі» (Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009), сталася тым самым універсальным зборнікам, з якім маленькі чытач можа і весяліцца, і вучыцца. У кожным вершы, загадцы, нават скорагаворцы за яскравым фасадам хаваецца і глыбокі змест. Кніга даказвае: нават вучачыся правільна вымаўляць гукі, можна вучыцца бачыць прыгожае, разумець прыроду і больш даведвацца пра свет. Як вам такія радкі: «У гародчыку чаромха расцвіла, / Пчоламі чаромха загула» ці вось такая паэтычная зарадка для маўленчага апарата: «Над возерам вецер лятае, / На хвалях лілеі люляе». А колькі розуму, досціпу і фантазіі ў смяшынках, шарадах і небыліцах з гэтай кнігі! Часам і даросламу цікава іх паразгадваць разам з дзецьмі.

Сапраўдным хітом продажаў у свой час стала наступная кніга аўтара — «Гульняслоў» (Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011). На яе старонках Міхась Пазнякоў паказаў, што словы можна не толькі запамінаць, вучыцца чытаць і пісаць, а з імі можна яшчэ і гуляць! І гэтыя гульні не менш захапляльныя, чым кіданне мяча, пераапрананне лялек ці «вайнушка». Варта толькі прыгледзецца, крыху падумаць — і слова атрымае зусім іншае значэнне. А можна пераставіць ці выкінуць толькі адну літару, нават націск — і перад намі зусім іншая, самастойная адзінка мовы. Гэтая кніга па сваім аздабленні і арганізацыі матэрыялу нагадвае школьны падручнік. Але гэта зусім не мінус выдання, хутчэй наадварот. Такі падыход крыху дысцыплінуе чытача: мы не проста жартуем і гуляем, мы вучымся. Але яркія сучасныя ілюстрацыі, сімпатычныя героі, што раз-пораз скачуць па старонках выдання, супакойваюць: не хвалюйся, дружа, гэта ж толькі ўяўная сур'ёзнасць, трэба перадусім весяліцца!

Зборнік казак і апавяданняў Міхася Пазнякова «Серабрыстыя чайкі» (Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2013) — ужо не такі вясёлы, ён не скіроўвае да гульні, а настройвае на роздум, павольнае чытанне. У кнігу ўвайшлі вершаваныя і празаічныя аўтарскія казкі, апавяданні, а таксама некаторыя з успамінаў мамы Міхася Паўлавіча пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Заўважце: разам з чытачом, які мог пазнаёміцца з першай кнігай колькі гадоў таму, нібыта пасталеў і аўтар, ён выбірае больш сур'ёзныя тэмы, піша творы большыя па аб'ёме і глыбейшыя па змесце. Надзвычай яркімі бачацца казкі Міхася Пазнякова, у якіх ён падае свае версіі з'яўлення на зямлі незвычайных серабрыстых чаек, чорных буслоў. У гэтых аповедах — сапраўдны палёт фантазіі пісьменніка, якому хочацца верыць, бо надта ж прыгожая легенда!

Упэўнена, гэтыя і іншыя дзіцячыя кнігі Міхася Пазнякова — выдатны набытак для кожнай хатняй бібліятэкі. Спадзяюся, аўтар і надалей будзе прысвячаць доўгія гадзіны творчасці маленькім чытачам, радаваць нас цікавымі і забаўляльнымі тэкстамі. Пісьменнік, безумоўна, заслугоўвае Дзяржаўнай прэміі краіны: за яго спінай — багатыя традыцыі айчыннай літаратуры для дзяцей, а ў яго постаці ўвасабляюцца памкненні многіх творцаў, якія і сёння пішуць дзіцячыя кнігі. Яны дакладна ведаюць, што гэта справа сур'ёзная і адказная. Можна нават сказаць больш: гэта справа дзяржаўнай значнасці.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

■ Прэм'ера

ТАНЦЫ СА СМЕРЦЮ

Вярнуць каханую да жыцця — толькі ахвяраваўшы сабой

«Хэпі-энд» на ўсходні лад: хтосьці павінен памерці, каб зацвіла кветка кахання для ўсіх людзей. Памірае Байджан — пакутуе Азер. Ён ідзе на змову з цёмнымі сіламі, каб яны адпусцілі каханую... Дзве стыхіі — каханне і смерць — кіруюць усім у балеце славутага азербайджанскага кампазітара Палада Бюльбюль аглы. Спектакль напрыканцы сезона з'явіўся ў афішы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатры опера і балета Беларусі. І няўжо вы думаеце, што імёны герояў балета — Азер і Байджан — выпадковыя?

Яны з племені агузаў, скарыць якіх імкнуцца каварныя кыпчакі. Забіраюць у палон, робяць рабамі, зневажаюць і гвалтуюць людзей, што так прагнуць свабоды. Байджан, якая толькі што заручылася з Азерам, лепш памрэ, чым падзеліць ложак са злосным ханам Гара-Мелікам. І сапраўды ж памірае... Але тут у барацьбу за яе ўключаюцца сілы кахання.

Пра гэта расказваецца ў старажытнацюркскім эпасе «Кніга майго Дзеда Каркуда», які ўзяў за аснову для сюжэта кампазітар Палад Бюльбюль аглы. На яго думку, створаны больш за 1000 гадоў таму помнік пісьмовай культуры народаў Усходу даводзіць спрадвечную мудрасць: дзе і ў чым варта шукаць духоўнае апірышча народам, якія якасці дапамагаюць утрымацца і захавацца, і чаму варта звяртацца да сваіх каранёў. Да напісання гэтага балета кампазітар прыйшоў, калі ў сваёй краіне ўзначальваў міністэрства культуры.

Разумныя кнігі, якія прыадчыняюць таямніцы паходжання, — яшчэ і духоўнае апірышча для краін, а гэта актуальна для маладых дзяржаў. Таму на мяжы XX і XXI стагоддзяў гэты балет прыходзіць на сцэну ў Азербайджане. У расійскія і беларускія тэатры ён прыйшоў, відаць, з-за імя кампазітара Палада Бюльбюль аглы, якога яшчэ з савецкіх часоў вельмі любілі як аўтара папулярных песень. А тут — балет, маштабны твор, які ў афішы штомесяц. Бяспройгрышны варыянт, каб забяспечыць аншлагі.

І сапраўды, калі хто хоча адкрыць Палада Бюльбюль аглы наноў як кампазітара акадэмічнай традыцыі, то твор «Каханне і смерць» дазволіць гэта зрабіць. Нездарма аўтар лічыць гэты балет галоўным у сваёй творчасці. Эпас патрабуе засяроджанасці — мы яе адчуваем ад самага пачатку, далей развіццё музыкі з яе разгалінаваннямі ў тэмы белага і чорнага сусветаў выбудоўвае ўсю драматычную канву: нават праз інструменты, якія «агучваюць» дзве гэтыя стыхіі. Насычаная галасамі і эмоцыямі тэма кахання супрацьпастаўляецца лаканічнаму, стрыманаму, але настойліваму рытму ўварвання сіл смерці. Змаганне гэтых стыхій за душы галоўных герояў прапісана самім аўтарам. Але яшчэ набыло патрэбнае эмацыянальнае гучанне ў аркестры, якім падчас прэм'еры кіраваў азербайджанскі дырыжор Эйюб Куліеў. Музыка – асобны герой пастаноўкі, яна вяла рэй у спектаклі яшчэ і таму, што не пазбаўлена таго каларыту, які скіроўвае да культуры краін Усходу (а гэта — справа тонкая, як мы памятаем).

За ўвасабленне ў беларускім тэатры балета «Каханне і смерць» узялася харэограф Вольга Костэль, якая ўпершыню выйшла на вялікую сцэну з маштабнай пастаноўкай. Спектакль сапраўды атрымаўся эпічным, дзе паступова развіваецца рамантычна-алегарычная гісторыя. Уся сутнасць яе паводле інтэрпрэтацыі Вольгі Костэль не столькі ў тым, дзе ўсё адбываецца, а ў тым, што мараль з усяго ўбачанага актуальная ў любой кропцы Зямлі. І крыху экзотыкі: павага да краіны паходжання балета захаваная перш за ўсё ў працы Кацярыны Булгакавай, мастака па касцюмах, якія героі мяняюць даволі часта. Свята Наўруз, калі Айзера і Байджан напаткала каханне, — адзін вонкавы вобраз. Ворагі-кыпчакі маюць адрознае ад агузаў увасабленне, ханскі гарэм пераканаўчы. І нават у тых парах, якія танцуюць на баку сіл Кахання і Смерці пазнаеш азербайджанскія строі. Пры тым, што супрацьстаянне белага і чорнага ў інтэрпрэтацыі харэографа падаецца канцэптуальным, хоць сам балет мог быць пастаўлены як абсалютна ўмоўнае і абстрактнае асэнсаванне тэм кахання і смерці.

Аўтар харэаграфіі была да гэтага схільная. Канструкцыя некаторых сцэн у балеце даволі складаная, здавалася, што артысты занепакоеныя тым, як правільна выканаць усе задачы. Можа таму спектакль падаўся стрыманым у эмацыянальным складніку з боку выканаўцаў, але ж гэта толькі першыя паказы... Відавочна, што беларускія прыхільнікі балета будуць з задавальненнем глядзець работу любімых артыстаў. Таму што ў партыі Байджан можна пабачыць Ірыну Яромкіну, Ганну Фокіну, Вікторыю Трэнькіну. Азера танцуюць Юрый Кавалёў, Ігар Аношка, Ягор Азаркевіч. У балеце наогул шмат парных танцаў, складаныя падтрымкі, якія змяняюць адна адну, не дазваляючы разняволіцца. Перфекцыянізм харэографа навідавоку: больш арыгінальнасці і эфектнасці, каб пазбегнуць спрошчанасці. У яе былі яшчэ задачы. Злучыць эпохі: далёкае мінулае і сучаснасць (таму што для гледача XXI стагоддзя). Злучыць часткі свету: каб усходняе адгукалася ў Беларусі.

Таму вечнасць тэмы выйшла на першае месца. І казачнасць узяла сваё: гісторыю ж трэба расказаць уцямна, а балет мала таго, што насычаны персанажамі, яшчэ і мае вялікую колькасць масавых сцэн, якія раскручваюцца вакол магутнага дрэва, што ўвасабляе жыццё. Яно з падачы мастака-сцэнографа Аляксандра Касцючэнкі іграе яшчэ адну ролю ў спектаклі: можа спаць і прачынацца (дзякуючы асвятленню), засмучацца, падавацца калючым і змрочна-засохлым у стане кыпчакаў, расквітае ў гонар кахання. Як жыве і кветка кахання, што застаецца Байджан ад Азера. Таму па ходзе дзеяння кожны з гледачоў дадае ўласныя эмоцыі. А наш народ, як выяўляецца, вельмі чуллівы.

Хто сумняваўся, што Паладу Бюльбюль аглы наладзяць авацыю? Хто сумняваецца, што спектакль будзе мець шчаслівы сцэнічны лёс? У нас любяць з каларытам. І ўсходняя тэма, у прыватнасці, у балеце, прадстаўлена цудоўна не адным спектаклем. Нават лепш, чым беларуская, дзе з тэмай нацыянальнай гісторыі звязаны «Князь Вітаўт» кампазітара Вячаслава Кузняцова. І наогул беларускіх балетаў цяпер на сцэне — па пальцах пералічыць. Любая пастаноўка аўтаматычна становіцца падзеяй нацыянальнага маштабу (як яшчэ і «Маленькі прынц» Я. Глебава). Тэатру можна гэтым карыстацца. Тым больш што сярод нашых сучасных кампазітараў шмат тых, хто гатовы пісаць балеты для тэатра. І беларуская мелодыка стала б тым каларытам, за якім бы бачыўся ўсё ж Вялікі тэатр Беларусі, які носіць званне нацыянальнага. І кветкі ў нашых паданнях не менш таямнічыя.

Ларыса ЦІМОШЫК

20 июля 2016 г. №11-А/2016

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение	Наличие ограничений	Срок аренды, (лет)	Начальная стоимость, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку докум-ции, бел. руб.
1	район индивидуальной жилой застройки «Хутор» (участок №277 по генплану)	340100000007007143	0,1451	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома семейного типа для детей-сирот	охранная зона объектов газораспределительной системы, охранная зона сетей и сооружений канализации	2	14 489 203 (1 448.92)*	724 460 (72.45)*	24 123 846 (2 412.38)*
2	район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок №252 по генплану)	340100000008002484	0,0756	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	охранная зона связи и радиофикации	99	42 075 634 (4 207.56)*	2 105 000 (210.50)*	13 012 045 (1 301.20)*

** в скобках указана стоимость, действующая после проведения деноминации 1 июля 2016 года.*

1. Организатор аукциона — Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

